Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЛЮТАГА 2017 г. СЕРАДА № 21 (28385)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## У топе — айцішнікі і фінансісты

СТАР. 4



## Чаму свіння пад забаронай?

МС



## Калі соль, дык толькі з ёдам

СТАР. 14

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Узровень навукова-тэхнічнага прагрэсу з'яўляецца вызначальным фактарам для развіцця краіны. Той, хто стварае найноўшыя тэхналогіі, мае больш перспектыў эканамічнага росту, чым тыя, хто вымушаны іх набываць. У Год навукі ў рэгіёне мы хочам зрабіць рэальныя крокі па падтрымцы вучоных і навукі, у першую чаргу па ўдасканаленні матэрыяльнай базы для іх працы. Гэтаму будзе служыць стварэнне інавацыйнага аб'екта — навукова-тэхналагічнага парка, які будзе падтрымліваць вопытных і маладых навукоўцаў. У абласным бюджэце ўжо запланаваны сродкі, распрацавана дарожная карта па рэалізацыі праекта».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.02.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9356 | ▼ |
| Еўра | 2,0703 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0322 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0714 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# Крыніца на Авуце



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

22-гадовы жыхар вёскі Язна Вадзім ЧАРНЯЎСКІ працуе ў брыгадзе будаўнікоў Мёрскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі па ўпарадкаванні, будоўлі і капрамонце дамоў для насельніцтва. У вольны час ён дапамагае наводзіць парадак вакол грамадскай лясной крыніцы, якая ўпадае ў рэчку Авута.

■ Сацыяльны клопат

## По прынцыпе справядлівасці

Непрацуючых прадпрымальнікаў хочуць вызваліць ад страхавых узносаў

**Такая прапанова сенатарам паступіла ад мінскага абласнога ўпраўлення Фонду сацабароны насельніцтва. Цяпер індывідуальным прадпрымальнікам неабходна выплачваць страхавыя ўзносы незалежна ад таго, ажыццяўляюць яны сваю дзейнасць ці не. Хоць да 2014 года тых з іх, у каго не было даходу, не абавязвалі рабіць адлічэнні ў ФСАН. Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Марыяна ШЧОТКІНА прапанову падтрымала. «Гэта будзе справядліва ў адносінах да людзей», — пракаментавала яна падчас «круглага стала» на базе прадпрыемства «Азярыцкі-Агра», дзе абмяркоўвалі шляхі ўдасканалення сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва.**

СТАР. 4

ЗАЎТРА — ПРАМАЯ ЛІНІЯ

## УСЁ АБ ЖЫЛЛЁВЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ

Ці падлягае падаткаабкладанню падораная кватэра? Ці можна прадаць кватэру, пабудаваную з дапамогай ільготнага крэдытавання? Як падзяліць асабовыя рахункі? Што рабіць, калі суседзі пастаянна шумяць? Ці магчыма выселіць уласніка з кватэры?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой тэлефоннай лініі госцю нашай рэдакцыі — **адвакату спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі №3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлане КАСЦЕВІЧ.**

Прамая лінія пройдзе **2 лютага з 11 да 12 гадзін.** Наш тэлефон 8 (017) 287-18-71.

***Папярэднія пытанні можаце задаваць 31 студзеня і 1 лютага па тэлефоне 8 (017) 287-18-29 у працоўны час альбо 2 лютага з 10 да 11 гадзін па тэлефоне 8 (017) 287-18-71. Або можаце даслаць свае пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by ці па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.***

■ Ведай нашых

## ТОЕ, ШТО САМОМУ ПАТРЭБНА

**Мазыранін Станіслаў ДВОРАК — прыхільнік здаровага ладу жыцця. Разам з жонкай Вікторыяй любіць вандраваць на веласіпедзе. Але ж у аднапакаёўцы без балкона, дзе жывуць маладыя бацькі разам з маленькім сынам Ільёй, складана недзе захоўваць любімыя транспартныя сродкі.**

Таму задума, якую прапанаваў на рэспубліканскі конкурс «100 ідэй для Беларусі» 25-гадовы намеснік начальніка канструктарскага аддзела прадпрыемства «Мазырсоль», для яго самога — больш чым надзённая. Гаворыць, у многіх краінах існуюць самыя розныя варыянты захоўвання мабільнага транспарту — у залежнасці ад рэгіёна.



Станіслаў распрацаваў праект гаража, які можна ўладкаваць літаральна пад вокнамі свайго дома. Больш за тое, яго распрацоўка экалагічная, бо прадугледжвае ўладкаванне газона непасрэдна на даху збудавання.

— Узнікла такая ідэя: зрабіць малагабарытнае памяшканне для захоўвання веласіпедаў. Сутнасць у тым, што яно будзе знаходзіцца непасрэдна на дваровай тэрыторыі, каля дома.

СТАР. 15

■ Парламенцкі дзённік

# БОЛЬШ ПРАСТОРЫ ДЛЯ БІЗНЕСУ

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў сабраліся разам з навукоўцамі і бізнесменамі, каб абмеркаваць, якія змены ў Крымінальным кодэксе адаб'юцца найлепшым чынам на развіцці прадпрымальніцтва. «Круглы стол» «Крымінальная палітыка ў адносінах да злачынстваў супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці» падняў пытанні, якія цяпер хвалююць бізнес-супольнасць. Магчыма, ён стане першай з шэрагу такіх сустрэч.**

— Злачынствы эканамічнай накіраванасці ўяўляюць сур'ёзную пагрозу для бяспекі дзяржавы. У сувязі з гэтым на працягу двух дзесяцігоддзяў у краіне дзейнічае жорсткая крымінальна-прававая палітыка ў дачыненні да злачынстваў супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці, — расказвае **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве Наталля ГУЙВІК.** — У тыя гады гаспадарчыя злачынствы былі звязаныя з агульнай крымінальнай злачыннасцю, таму і была ўсталявана павышаная адказнасць. Цяпер сітуацыя змянілася, грамадзяне сталі больш законапаслухмянымі. Таму, на наш погляд, прыйшоў час гуманізацыі крымінальна-прававой палітыкі ў сферы эканамічных злачынстваў і паўстала неабходнасць вызначыць, якія нормы Крымінальнага кодэкса і Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях замінаюць развіццю бізнесу і прыцягненню інвестыцый.

Прадстаўнікі навукі таксама выступаюць за змены ў заканадаўстве. Так, напрыклад, **дацэнт кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта БДУ Аляксей ЛУКАШОЎ** прапанаваў адмяніць канфіскацыю маёмасці як від пакарання. «Канфіскуюць поўнасцю або часткова маёмасць, якая належыць вам на законных падставах. Не даказана, што ўсё гэта нажыта незаконным спосабам. Калі хочаце пакараць, ёсць адпаведныя варыянты: штрафныя санкцыі, крымінальна-прававая кампенсацыя... Канфіскацыя павінна пакінуць Крымінальны кодэкс, а застанецца спецыяльная канфіскацыя». Ёсць пералік, што вызначае, у якіх выпадках можна выкарыстоўваць гэты від пакарання, напрыклад, для пазбаўлення маёмасці, набытай незаконным спосабам.

Другая прапанова — выключыць артыкул 234-ы «Лжэпрадпрымальніцтва». Пра гэту ідэю расказала **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па эканамічнай палітыцы Ганна КАНАПАЦКАЯ**:

— З майго пункту гледжання і з пункту гледжання бізнес-супольнасці, для таго каб падштурхнуць дзелавую ініцыятыву, заахвоціць самазанятасць, ажывіць дзелавое асяроддзе, нам неабходна стварэнне якаснага дзелавога клімату, а артыкул «Лжэпрадпрымальніцтва» нясе ў сабе адмоўны сэнс. Адмена 234-га артыкула дазволіць, перш за ўсё, абараніць уласнікаў, стварыць станоўчы дзелавы клімат і будзе спрыяць станоўчаму іміджу Беларусі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■

## ПАЧУЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны працягваюць работу прамыя тэлефонныя лініі**

**Разбіраццa ў камунальных, жыллёвых, дарожных і іншых набалелых пытаннях 4 лютага будуць прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі спраў. Патэлефанаваць чыноўнікам можна з 9 да 12 гадзін. Нагадаем, «гарачыя» лініі працуюць кожную суботу.**

**Брэсцкі аблвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Вітальевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч (80172224444).

■ Кампетэнтна

Палітолаг Усевалад ШЫМАЎ:

# «КРАІНА ЗНОЎ АПЫНУЛАСЯ ПАМІЖ МОЛАТАМ І КАВАДЛАМ»



**Для Беларусі гэты год у знешнепалітычным плане пачынаецца даволі цікава. Прэзідэнт дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ аб бязвізавым уездзе для грамадзян 80 дзяржаў свету, а Еўрасаюз выдзеліў грошы на лагеры для бежанцаў на нашай тэрыторыі. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з палітолагам Усеваладам Шымавым, дацэнтам кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта БДУ, і высветліў, як змяняцца нашы адносіны з Еўрапейскім саюзам, з Расіяй і ці варта чакаць патокаў мігрантаў у Беларусі.**

### Акно ў Беларусь

***— Якой рэакцыі на бязвізавы ўезд варта чакаць ад Еўрапейскага саюза?***

— Складана сказаць, бо пакуль што асаблівай рэакцыі з боку ЕС мы не назіраем. Размовы аб палягчэнні візавага рэжыму вядуцца ўжо даўно. Беларусь у гэтым плане знаходзіцца ў няпростым становішчы, таму што візы для нас вельмі дарагія, нават калі параўноўваць з Расійскай Федэрацыяй. Таму я думаю, што гэты крок быў разлічаны на тое, што з боку ЕС будуць зроблены нейкія дзеянні ў адказ. Будзем чакаць.

***— Якое рашэнне з боку Беларусі можа з'явіцца ўслед за гэтым крокам?***

— Гэта пытанне не толькі беларуска-еўрапейскіх адносін, але і беларуска-расійскіх. У расійскіх СМІ рэакцыя на гэты крок была неадназначнай, а пазней з'явіліся паведамленні, што расійскі бок увёў нагляд пасажыраў з Беларусі ў аэрапортах, чаго ўжо даўно не было. Паколькі мы з'яўляемся ўдзельнікам інтэграцыйных аб'яднанняў з Расійскай Федэрацыяй, то і візавая палітыка ў дачыненні да трэціх краін павінна мець узгодненых характар. Таму далейшыя дзеянні Беларусі ў гэтым кірунку залежаць ад пазіцыі Расіі. Улічваючы яе складаныя адносіны з краінамі ЕС, а таксама з ЗША, такія крокі беларускага боку могуць успрымацца досыць хваравіта. Неабходны баланс, які задаволіць усе зацікаўленыя бакі.

***— Які, на ваш погляд, вектар развіцця для Беларусі больш перспектыўны — Еўразійскі эканамічны або Еўрапейскі саюз?***

— Безумоўна, ЕАЭС, таму што ў гістарычным, культурным, моўным і эканамічным кантэкстах мы прывязаны да гэтага рэгіёна. Тут нашы традыцыйныя рынкі збыту, тут рэсурсная база для беларускай эканомікі.

Акрамя таго, мы бачым, што еўрапейская інтэграцыя сёння перажывае вельмі глыбокі крызіс. Еўрапейскаму саюзу цяпер не да пашырэння. Калі яшчэ 10 гадоў таму, у часы імклівага пашырэння ЕС, узнікала ідэя пераарыентавацца на Захад, то сёння цалкам відавочна, што ў Еўропе нас абсалютна не чакаюць, Еўрасаюзу мы як удзельнік аб'яднання не патрэбныя, таму адказ на пытанне відавочны. Вядома, нам трэба падтрымліваць максімальна добрасуседскія і цесныя адносіны, але казаць пра інтэграцыю ў Еўрапейскі саюз — абсалютна бессэнсоўна.

### Адзінства народа і мяжы

***— На свята Божага Нараджэння Прэзідэнт заявіў: «Мы нікому не можам аддаць гэтую зямлю і гэтую дзяржаву. Яна нам дасталася ў няпростай гістарычнай рэчаіснасці... Усевалад Уладзіміравіч, чаму менавіта цяпер зайшла гаворка аб адзінстве народа і дзяржаўных межаў?***

— Гэтая тэма стала праяўляцца не цяпер. На мой погляд, яна здабыла павышаную актуальнасць з 2014 года. Цалкам зразумела, што гэтыя словы прагучалі ў кантэксце украінскага крызісу, а таксама ў кантэксце пагаршэння адносін паміж Расіяй і краінамі Захаду. У выніку абвастрэння Беларусь апынулася, з аднаго боку, у звыклым, а з другога — у некамфортным становішчы паміж молатам і кавадлам. Таму ў гэтай сітуацыі патрыятычная мабілізацыя грамадства выглядае цалкам заканамернай.

***— Каму можа быць адрасавана заява нашага дзяржаўнага лідара?***

— Думаю, што яна мае шматбаковага, шматвектарнага адрасата. Заява накіравана на розныя бакі: на поўдзень, на поўнач, на ўсход і на захад. Але ў першую чаргу для нас актуальна геапалітычнае супрацьстаянне Захаду і Усходу, якое існуе ў нашым рэгіёне. Таму пасыл тут накіраваны як і ў бок ЕС і НАТА, Злучаных Штатаў Амерыкі, з якімі ў нас адносіны дастаткова праблемныя заставаліся і застаюцца, нягледзячы на ўсе дыпламатычныя манеўры, што апошнім часам робіцца, так і ў бок Масквы, таму што адносіны паміж Расіяй і Беларуссю апошнім часам таксама носяць досыць праблемны характар. Гэта значыць, з аднаго боку, мы саюзнікі, а з другога — наша інтэграцыя прасоўваецца даволі цяжка з-за пэўных несупадзенняў трактовак нашага супрацоўніцтва. Таму гэта сігнал для Масквы аб тым, што для беларускага боку саюзніцтва з Расіяй застанецца прыярытэтам, але яно павінна будавацца на цалкам раўнапраўных узаемапаважлівых парытэтных асновах.

### Ці трэба баяцца бежанцаў?

***— Нядаўна стала вядома, што Еўрасаюз прафінансуе будаўніцтва лагераў для бежанцаў у Беларусі. Магчыма, у найбліжэйшай будучыні колькасць мігрантаў у нас павялічыцца. Наколькі рэальна паўтарэнне сітуацыі Германіі, дзе пастаянна адбываюцца беспарадкі?***

— Здарылася пэўнае непаразуменне. Наколькі я разумею, гаворка ідзе не пра тое, што да нас будуць дасылаць мігрантаў з Афрыкі ці той жа Сірыі. Гаворка менавіта пра тое, што будуць створаны цэнтры для тых, хто незаконна перайшоў мяжу, трапіў у Еўрасаюз з тэрыторыі Беларусі. Мы гаворым пра грамадзян Украіны, Расіі, краін Сярэдняй Азіі. У прынцыпе праблема не новая, Беларусь выступае як транзітны калідор для рознага роду нелегальных мігрантаў ужо даўно. І я думаю, што перагаворы, вынікам якіх стала фінансаванне лагераў з боку ЕС, вяліся даўно. Зноў жа, наш Прэзідэнт неадназоава падкрэсліваў, што Беларусь з'яўляецца фарпостам, бар'ерам на шляху нелегальнай міграцыі. Таму тут гаворка ідзе не пра тое, што да нас будуць перасяляць тых нелегальных мігрантаў, якія праніклі ў ЕС з тэрыторыі Турцыі, Паўночнай Афрыкі.

***— Як ставіцца да бежанцаў беларусам?***

— Беларусы проста не сутыкаліся з гэтай праблемай, таму сфармуляваных адносін у нас да іх няма. Бежанцы — гэта заўсёды праблемы. Гэта дадатковая сацыяльная нагрузка, гэта цяжкасці крымінальнага характару. Зразумела, што яны выклікаюць негатыў. Тая напружанасць, якая ўзнікла ў Еўропе, цалкам заканамерная. Іншае пытанне, што самі ўцекачы ў такой сітуацыі не вінаватыя. Бежанцы, як правіла, з'яўляюцца ахвярамі абставін. Лагеры могуць стаць рассаднікамі крыміналу, наркаманіі, але не таму, што гэта людзі такія, сапсаваныя ад прыроды, гэта не так. Жыццё паставіла іх у такія ўмовы. Таму бежанцы — гэта глабальная праблема, звязаная з дэфектамі глабальнага развіцця, калі людзі вымушаны пакідаць свае месцы жыхарства.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Times: Мэй запусціць механізм Brexit 9 сакавіка



**Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй прымяніць 50-ы артыкул Лісабонскага дагавора, які запускае двухгадовую працэдуру выхаду краіны — члена Еўрасаюза з супольнасці, 9 сакавіка. З такім прагнозам выступіла газета Times.**

Выданне адзначае, што, нягледзячы на тое, што кіраўнік кабінета міністраў не мае намеру загадзя агучваць дату запуску механізма Brexit і афіцыйна толькі пазначыла лімітавай рысай канец сакавіка, у мінулы панядзелак урад праінфармаваў палату лордаў, што хоча, каб законапраект аб выхадзе Злучанага Каралеўства з ЕС быў ухвалены 7 сакавіка. На наступны дзень міністр фінансаў Філіп Хаманд выступіць з бюджэтным пасланнем, а 9 сакавіка на Мальце пачнецца двухдзённы саміт ЕС, на якім у Мэй і з'явіцца магчымасць заявіць аб уведзенні ў дзеянне артыкула 50-га і прыступіць да перагавораў з Брусселем аб умовах выхаду Вялікабрытаніі з супольнасці. Калі названы газетай графік увасобіцца ў рэальнасць, то з улікам двухгадовага ліміту на гэтыя перагаворы Вялікабрытанія перастане быць членам ЕС не пазней за 9 сакавіка 2019 года.

### Амерыканцы падтрымалі ўвядзенне міграцыйнага ўказа Трампа

**Па выніках апытання, праведзенага кампаніяй Rasmussen Reports, 57% амерыканцаў падтрымліваюць увядзенне абмежавання на ўезд у краіну, усталяванае прэзідэнтам Дональдам Трампам.**

Як пішуць мясцовыя выданні, кампанія правяла тэлефоннае і інтэрнэт-апытанне, спытаўшы меркаванне звычайных амерыканцаў з нагоды нашумелага ўказа Трампа аб увядзенні забароны на ўезд грамадзянам сямі мусульманскіх краін у ЗША.

Паводле даных апытання, каля 57% рэспандэнтаў падтрымалі рашэнне прэзідэнта і станоўча ахарактарызавалі новы ўказ, 33% выступілі супраць забароны, яшчэ 10% не змаглі адказаць. Таксама вынікі паказалі, што больш за палову рэспандэнтаў падтрымалі ўвядзенне кароткатэрміновай паўзы на выдачу амерыканскіх віз.

Адзначаецца, што ўказ Трампа накіраваны на правядзенне праверак для бежанцаў з мэтай, каб «радыкальныя ісламскія тэрарысты» не пранікалі ў ЗША.

Раней паведамлялася, што большасць амерыканцаў не ўхваляюць працу Трампа.

### Літва хоча забраць у Расіі Калінінградскую вобласць

**Дэпутат сейма Літвы Лінас Бальсіс прапанаваў забраць у Расіі Калінінградскую вобласць, перадае Baltnews.lt.**

Дэпутат заявіў, што «час Калінінграда скончыўся». Ён сказаў, што Калінінградская вобласць не была аддадзена Расіі назаўжды. «Было сказана: аддаём пад адміністрацыю СССР да таго часу, пакуль у Еўропе не будзе падпісаны канчатковы мірны дагавор», — заўважыў ён.

На думку дэпутата, заняцца вяртаннем тэрыторыі павінны Літва альбо ЕС, або і Вільнюс, і Брусель.

Раней прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў, што дыскусіі аб пераглядзе вынікаў Другой сусветнай вайны могуць адкрыць «скрыню Пандоры».

### У Нігерыі памёр 93-гадовы бацька 203 дзяцей

**Ён меў 130 жонак, паведаміла газета Daily Trust.**

Мусульманскі прапаведнік Альхаджы Махамед Абубакар Бэла Масаба яшчэ пры жыцці быў прызнаны «супермнагажэнцам». У адным з інтэрв'ю Масаба прызнаўся журналістам, што самае цяжкае ў яго жыцці — даць рады ўсяму гэтаму неймавернаму ліку дамачадцаў і што «яго выратоўвае толькі дапамога Усявышняга».

Погляды Масабы на сям'ю ўхвалялі далёка не ўсе. Калі яму было яшчэ 84 гады, а жонак і дзяцей было толькі 86 і 170 адпаведна, ісламскі суд патрабаваў ад яго пакінуць сабе толькі чатырох жонак, як належыць паводле Карана. Інакш яму пагражалі пакараннем смерцю. У адказ Масаба заявіў, што ў Святым пісанні нідзе не ўпамінаецца пра пакаранне за наяўнасць больш як чатырох жонак.

■ Армія

# БЫЦЬ НА СУВЯЗІ

## У Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі будуць рыхтаваць спецыялістаў для Узброеных Сіл

**Нягледзячы на тое, што ўрачыстае адкрыццё ваеннай кафедры адбылося ўчора, навучанне малодшых камандзіраў вядзецца ўжо некалькі дзён.**

— Кожная спецыяльнасць запатрабаваная ва Узброеных Сілах: ці ты мотастралок, ці рамонтнік, зенітчык, РТВ-шнік, — адзначыў падчас урачыстага адкрыцця ваеннай кафедры **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — Але найбольш запатрабаванай, вядома, з'яўляецца сувязіст, падрыхтаваць якога — складаная задача. У чалавека, які выбраў гэтую спецыяльнасць, павінен быць адпаведны набор якасцяў, уласцівых толькі сувязістам.

На думку **міністра сувязі і інфарматызацыі Сяргея ПАПКОВА,** адкрыццё ваеннай кафедры — знакавая падзея для айчыннай гісторыі. «Маладых людзей, якія будуць тут навучацца, падрыхтуюць па тых спецыяльнасцях, што патрэбны як у мірны час, так і тады, калі спатрэбіцца ўзяць у рукі зброю і абараняць нашу краіну».

На ваеннай кафедры будзе ажыццяўляцца навучанне па важных і дэфіцытных спецыяльнасцях у інтарэсах Узброеных Сіл. Аўдыторыі, дзе праводзяцца заняткі, укамплектаваны сучасным абсталяваннем, якое прымяняецца ў войску. Унікальнасць навучальных класаў заключаецца яшчэ і ў тым, што яны прадстаўляюць сабой баявыя пасты стацыянарнага вузла сувязі, уключанага ў адзіную сістэму сувязі Узброеных Сіл. Такім чынам, студэнты будуць адпрацоўваць вучэбна-баявыя задачы, у тым ліку і падчас правядзення вучэнняў і трэніровак.

— У сучаснай вайне пры роўных іншых умовах перавага будзе на тым баку, які валодае найбольш дасканалай сістэмай кіравання, тэхнічнай асновай чаго з'яўляецца сістэма сувязі, — перакананы **начальнік сувязі Узброеных Сіл — начальнік упраўлення сувязі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Генадзь КАЗАКОЎ.** — Вопыт баявога прымянення новых, а таксама мадэрнізаваных сродкаў і комплексаў сувязі паказвае, што для іх правільнай эксплуатацыі патрабуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты. Некаторыя выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі ўжо паспяхова выконваюць задачы падчас тэрміновай ваеннай службы, многія звязваюць свой лёс з арміяй, у выніку чаго становяцца прапаршчыкамі і афіцэрамі.

Плануецца, што на ваеннай кафедры таксама будуць рыхтаваць спецыялістаў для Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Здарэнні

# Каб пачулі, залезла... на кран

**Учора ў сталіцы жанчына забралася на вежавы кран, пратэстуючы супраць зносу дома. Інцыдэнт адбыўся ў мікраараёне Лебядзіны. Жыхарка былой вёскі Ржавец пратэставала супраць высялення з прыватнага дома. Менавіта на 31 студзеня быў запланаваны візіт судовых выканаўцаў, якія павінны былі вызваліць памяшканні будынка. На яго месцы кампанія-забудоўшчык планує ўзвесці жыллёвы комплекс. Насельнікам дома (самой жанчыне, яе быламу мужу, а таксама дзецям з іх сем'ямі) была прапанавана кампенсацыя ў выглядзе трох кватэр, але яна іх не задаволіла.**


Фота БЕЛТА.

Як паведамляюць у ГУУС Мінгарвыканкама, у 8 гадзін раніцы з Міністэрства па надзвычайных сітуацыях паступіла паведамленне аб тым, што на вежавым кране па вуліцы Ржавецкай знаходзіцца жанчына. На месца прыбылі кіраўніцтва і супрацоўнікі міліцыі, ратавальнікі, брыгада хуткай медыцынскай дапамогі. Начальнік ГУУС Мінгарвыканкама, генерал-маёр Аляксандр Барсукоў уступіў з жанчынай у перагаворы па мабільным тэлефоне. Высветлілася, што такім чынам яна патрабавала кампенсацыі за знос свайго жылога дома ў Лебядзіным. Спробы паднясца на кран для перагавораў не завяршыліся поспехам — жанчына пагражала скінуцца нават калі да яе збіралася наблізіцца нявестка.

У выніку кампраміс усё-такі знайшлі: начальнік ГУУС паабяцаў адвезці родных жанчыны ў Мінгарвыканкам на сустрэчу з кіраўніцтвам горада. Па прыбыцці на месца тыя па тэлефоне паведамілі гаспадыні дома, што яна адбылася. Аднак у 11 гадзін жанчыне стала блага. Заўважыўшы гэта, двое пераапранутых у форму будаўнікоў супрацоўнікаў АМАП падняліся на кран і аказалі ёй першую медыцынскую дапамогу. Затым жанчыну разам з ратавальнікамі спусцілі на зямлю і перадалі брыгадзе хуткай дапамогі. Паводле непацверджанай інфармацыі, у яе дыягнаставалі пераахаладжэнне.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Пераарыентацыя

# ВЯРНУЦЬ ГРОШЫ І НЕ ПАРУШЫЦЬ ПРАВЫ

**«Асноўны крытэрый дзейнасці судовых выканаўцаў — спагнанне праблемных даўгоў. Хто б каму ні быў вінаваты грошы, ад нас патрабуецца спагнаць іх своечасова і хутка», — запэўніў галоўны судовы выканаўца Беларусі Дзмітрый КАВАЛЕНКА перад калегіяй Міністэрства юстыцыі па падвядзенні вынікаў работы органаў прымусовага выканання за 2016 год. За мінулы год па ўсіх выканаўчых дакументах спагнана даўгоў на 1,6 млрд, у даход дзяржавы — 160,5 млн рублёў, а гэта ў 2,2 раза больш, чым у 2015-м.**

Мадэрнізацыя органаў прымусовага выканання пачалася яшчэ ў 2014-м, і да мінулага года большасць праблем, звязаных з гэтым, была пераадолена. Сапраўды знакавай падзеяй стала прыняцце ў 2016 годзе Законаў «Аб судовых выканаўцах» і «Аб прымусовым выкананні», якія ўступяць у сілу сёлета 13 і 16 мая.

Прадстаўнік Мінюста адзначыў, што колькасць заведзеных судовых спраў расце з году ў год. Усяго за 2016-ы паступіла каля 2,7 млн выканаўчых дакументаў, што ў сваю чаргу выклікае рост нагрузкі на судовых выканаўцаў. Штомесяц на кожнага з іх прыходзіцца па 203 выканаўчыя дакументы. На раённым узроўні гэты паказчык павялічыўся на 2,1%, на абласным — на 21%. Апошняя лічба тлумачыцца вялікай колькасцю спраў па спагнанні даўгоў з юрыдычных асоб.

— Мы хочам пераарыентаваць работу ўсіх органаў прымусовага выканання такім чынам, каб усе выканаўчыя дакументы, незалежна ад катэгорыі даўжніка, выконваліся, — падкрэсліў Дзмітрый Каваленка. — З прыняццем новага закона аб прымусовым выкананні з'явілася новая падстава для абмежавання спецправоў даўжнікоў. У прыватнасці, гэта датычыцца юрыдычных асоб, якіх цяпер па судзе можна абмежаваць у праве выезду за мяжу.

Органы прымусовага выканання цяпер падключаны да 18 асноўных баз дзяржаўных органаў і арганізацый, што дазваляе аператыўна атрымліваць інфармацыю пра маёмасць і здабыткі даўжнікоў і скарачае час пошуку.

— Без доступу да гэтай інфармацыі было б вельмі цяжка спагнаць даўгі, — пракаментаваў галоўны судовы выканаўца. — Тым не менш абмежаваць спецправы даўжніка можна толькі праз суд пасля звароту туды судовага выканаўцы. Існуе вельмі тонкая грань па прымяненні на практыцы ўсіх паўнамоцтваў і правоў, якімі валодаюць судовыя выканаўцы сёння. Галоўнае — своечасова спагнаць доўг, аднак пры гэтым нельга парушыць правы даўжніка.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ На свае вочы



# ТРАКТАРНЫЯ ГОНКІ ПАД... ПАРЫЖАМ



## Першае ў Беларусі ралі на трактарах прайшло ў Віцебскай вобласці

Калі на старце ўздзельнікі сустрэліся з цалкам знаёмай «перашкодай» і на поўнай хуткасці праімнулі кукурузнае поле, то далей пілоты сельскагаспадарчай тэхнікі па лёдзе пераадольвалі вадаём, шукалі брод у ямах з граззю і стараліся ўтрымацца на слізкім маршруце цераз лес.

У спаборніцтвах удзельнічала дзве каманды. У першай былі машыны, якія толькі сышлі з канвеера і прадстаўлялі Мінскі трактарны завод. Другая складалася з трактароў, якія працавалі ў сельскіх гаспадарках Віцебскай вобласці. Акрамя агульнага заезду, кіроўцы новай тэхнікі паспелі згуляць у трактарны футбол вялізнымі мячамі. Яшчэ адным цікавым для гледачоў відовішчам стала «перацягванне каната». У выніку гусенічны трактар хоць і перакапаў зямлю побач з сабой, але здолеў зрушыць з месца свайго калёснага сабрата.

На фінішы ў пасёлку Мосар Глыбоцкага раёна экіпажы сустракалі віншаваннямі і падарункамі. А гледачы змаглі пафатаграфавацца на фоне магутнай тэхнікі і пасядзець у кабіне. Як адзначыў губернатар Віцебскай вобласці Мікалай Шарстнёў, падчас першага ў краіне заезду на трактарах асноўнай задачай было паказаць сімбіёз прамысловасці і сельскай гаспадаркі, прадэманстраваць якасць тэхнікі і прафесіяналізм людзей, якія працуюць на ёй.

Ва УП «Паўночны» механізатар Мікалай Чухноў прыйшоў следам за бацькам і працуе ўжо каля 30 гадоў. Трактар МТЗ 3522 атрымаў гэтым летам, прычым асвоіў новую тэхніку настолькі, што стаў лепшым працаўніком раёна падчас пасяўной. Прадстаўляць Віцебскую вобласць на ралі мужчына адправіўся разам са сваім «жалезным сябрам», да фінішу прыйшоў трэцім.

— Наша тэхніка на гоначны балід непадобная. Трактар больш прыстасаваны цягнуць за сабою цяжкі агрэгат, таму самая высокая хуткасць, якую развівае «Беларус», — 39 кіламетраў у гадзіну. У лесе было і вузка, і слізка, так што абагнаць саперніка на гэтым участку не атрымлівалася. У асноўным, на маршруце абышлося без непрыемнасцяў, гразевую лужыну праскочыў так хутка, што нават запэцкацца не паспеў. Калі поле ўзворваеш, то, часам, трукі куды цікавейшыя даводзіцца выпісваць, — жартуе Мікалай. — Куды больш складана было ўтрымацца ў кабіне. Ехаць давялося папярок бaрознаў, прычым замест таго, каб скідаць хуткасць, трэба было наадварот, ціснуць на педаль.

Першае трактарнае ралі выклікала інтарэс у гледачоў і, па словах прадстаўніка МТЗ, можа атрымаць працяг у наступныя гады.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

**НАПЯРЭДАДНІ Дня беларускай навукі жыхары пасёлкаў Парыж і Мосар сталі балельшчыкамі незвычайнага для нашай краіны спаборніцтва. Кіроўцы новай мадэлі трактароў МТЗ выпрабоўвалі свае машыны пагоднымі і прыроднымі ўмовамі. За гонкай гледачы сачылі з вышыні — відэакамеры на квадракоптарах перадавалі «карцінку» з трасы ў анлайн-рэжыме.**




Фота БЕЛТА.

■ Рэйтынг даходаў

# Айцішнікі па-ранейшаму ў топе

## Праграмісты атрымліваюць у 8 разоў больш, чым сацыяльныя работнікі



Фота БЕЛТА.

**Лідарамі заробкавага рэйтынгу традыцыйна застаюцца праграмісты. Месячны даход сярэднестатыстычнага айцішніка складае 3,5 тысячы рублёў. На другім месцы спецыялісты, якія займаюцца дапаможнай дзейнасцю ў сферы фінансавых паслуг і страхавання. Іх заработная плата — 2790 рублёў. У тройцы самых высокааплатных аказаліся таксама работнікі грузавога паветранага транспарту, якія атрымліваюць па 2442 рублі.**

Сярэдні заробак у прамысловасці — 880 рублёў. Пры гэтым у горназдабываючай прамысловасці і на вытворчасці коксу і прадуктаў нафтаперапрацоўкі атрымліваюць пад 1300 рублёў, у паліграфіі і на вытворчасці фармацэўтычных прэпаратаў — 1000 рублёў. Занятыя ў будаўніцтве маюць у месяц 809 рублёў, транспартнікі — 840. А заробак навукоўцаў і архітэктараў у сярэднім складае 1246 рублёў.

635 рублёў у месяц плацяць работнікам турагенцтваў. Прыкладна столькі ж атрымліваюць медыкі — сярэдняя заработная плата ў галіне аховы здароўя складае 649 рублёў. Месячны даход настаўнікаў тым часам — 543 рублі.

Адной з самых нізкааплатных сфер аказалася сельская гаспадарка, дзе маюць у сярэднім 504 рублі. Супрацоўнікі бібліятэк, архіваў і музеяў атрымліваюць і таго менш — 444 рублі. А ў нізе рэйтынгу заробкаў — сацыяльныя работнікі. Нягледзячы на запатрабаванасць прафесіі, заробак застаецца невысокім — 435 рублёў.

Калі казаць пра рэальныя заробкі, а не намінальныя, то найбольш за мінулы год падраслі даходы праграмістаў — на 12 працэнтаў. На 6—8 працэнтаў больш сталі атрымліваць работнікі паветранага транспарту, зборшчыкі вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратуры. А вось даходы будаўнікоў за год упалі на 13 працэнтаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# Па прынцыпе справядлівасці

### Кандыдаты ў сядзелкі

Сярод прапаноў, якія агучваліся падчас «круглага стала», — зрабіць больш жорсткім кантроль пры назначэнні дапамогі па доглядзе інваліда 1-й групы ці асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

**Поўная цана за месяц сацыяльнага абслугоўвання (пры візіце работніка 5 разоў на тыдзень) вар'іруецца ад 26 да 29 рублёў. Але для розных катэгорый грамадзян аплата дыферэнцыравана.**

— Часам людзі, якія не хочуць працаваць, афармляюць дапамогу па доглядзе. Але ніхто не глядзіць, які лад жыцця яны вядуць. Законных падстаў адмовіць ім няма. Варта было б пытанне аб назначэнні дапамогі па доглядзе пакінуць на разгляд мясцовых органаў, каб у кожным канкрэтным выпадку вырашаць, каму яе выдаваць, а каму — не, — лічыць **намеснік старшыні Чэрвеньскага райвыканкама Ала ШАХОЦЬКА.**

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК** пагадзіўся: праблема ёсць. Былі выпадкі, калі пасля павелічэння бюджэту пражытковага мінімуму (ад яго залежыць памер дапамогі) рэзка ўзрастала колькасць ахвотных афоміць догляд пажылога сваяка. Але, адзначыў намеснік міністра, у мясцовых органаў і цяпер ёсць паўнамоцтвы пазбаўляць чалавека гэтых выплат, калі ён не клапоціцца пра падапечнага.

Па законе тыя, хто афармляе дапамогу па доглядзе, не могуць выйсці на работу, інакш пазбавяцца выплат. Марыяна Шчоткіна мяркуе, што неабходна зняць гэту забарону:

— Трэба дазволіць людзям працаваць на палову стаўкі, дыстанцыйна і пры гэтым захаваць дапамогу, як гэта будзе ў адносінах да бацькоў, што даглядаюць дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў. Так мы даём магчымасць фарміраваць права на пенсію.

### Адрасная дапамога былым зняволеным

Спрэчнае пытанне ўзняў Лагойскі райвыканкам: ці можна выключыць з ліку атрымальнікаў дзяржаўнай адраснай дапамогі асоб, якія знаходзіліся ў месцах пазбаўлення волі і таму не зарабілі стаж і жывуць на сацыяльную пенсію?

На думку Марыяны Шчоткінай, такое рашэнне было б не зусім правільным.

— Чалавек аступіўся, адседзеў. Ён ужо адбыў сваё пакаранне, — аргументуе яна. — Калі гэта грамадзянін у працаздольным узросце, ён можа яшчэ ўладкавацца на работу, каб палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. А калі пенсіянер, які атрымлівае палову бюджэту пражытковага мінімуму ў месяц (такі памер сацыяльнай пенсіі ўстаноўлены для мужчын і жанчын, якія дасягнулі 65 і 60 гадоў адпаведна. — **Аўт.**) і не ў стане падпрацоўваць? Мы ж не павінны ствараць неспрыяльную сітуацыю і штурхаць людзей на злачынства.

### Расцэнкі на сацыяльныя паслугі

Гаварылі таксама пра неабходнасць павысіць кошт норма-гадзіны сацыяльных паслуг. Сацработнікі Чэрвеньскага раёна звярнулі ўвагу на тое, што гэтыя лічбы не мяняліся ўжо некалькі гадоў. А ад іх, між іншым, залежаць заробкі супрацоўнікаў тэрытарыяльных цэнтраў.

— Устанаўліваць кошт норма-гадзіны — кампетэнцыя аблвыканкамаў. Гэта вызначана Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». Але мы настойліва рэкамендуем абласным органам павышаць расцэнкі, — адзначыў Аляксандр Румак.

Цяпер кошт норма-гадзіны ў рэгіёнах складае ў сярэднім 45—50 капеек. Поўная цана за месяц сацыяльнага абслугоўвання (пры візіце работніка 5 разоў на тыдзень) вар'іруецца ад 26 да 29 рублёў. Але для розных катэгорый грамадзян аплата дыферэнцыравана. Тыя, у каго сярэднедушавы даход ніжэйшы за бюджэт пражытковага мінімуму, атрымліваюць паслугі бясплатна. А для грамадзян, якія не з'яўляюцца адзінокімі, прадугледжана магчымасць заключэння трохбаковага дагавора, каб за візіты сацыяльнага работніка разлічваліся дзеці.

Марыяна Шчоткіна, у сваю чаргу, заўважыла, што тэрытарыяльным цэнтрам трэба развіваць пералік паслуг, каб павысіць заробкі сваім супрацоўнікам. Напрыклад, аказваць дапамогу іншым катэгорыям грамадзян, не вызначаным заканадаўствам, але ўжо за большую цану.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
*Смалявіцкі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Каля вытокаў

# «Віртуальныя падарожжы па старонках творчасці...»

**Макет сялянскай хаты сям'і Кандрата Крапівы ў вёсцы Нізок, асабістыя рэчы славутага пісьменніка і вучонага, рэпрадукцыі фотаздымкаў амаль стогадовай даўнасці — першае, на што звяртаеш увагу, пераступаючы парог гэтага школьнага музея. Пад шклом вітрын і на вялікім экране манітора — рэдкія дакументы, відэазапісы, якія расказваюць не толькі пра жыццё народнага пісьменніка Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы Кандрата Крапівы, але і прывязаную да яго постаці цэлую эпоху нацыянальнай літаратуры.**

...У гэты дзень залу Уздзенскай сярэдняй школы №2 імя К.К. Крапівы запоўнілі дарослыя наведвальнікі — удзельнікі семінара па вывучэнні вопыту літаратурна-краязнаўчых музеяў у далучэнні навучэнцаў да культурных каштоўнасцяў краіны і інавацыйнага падыходу ў стварэнні такіх музеяў. Ва ўстановах адукацыі Мінскай вобласці існуюць дзевятнаццаць літаратурных музеяў з асноўным і дапаможным фондам больш за 18 тысяч экспанатаў.

Зразумела, чаму педагогі з розных раёнаў звярнуліся да вопыту сваіх уздзенскіх калег: менавіта тут апошнім часам была праведзена рэканструкцыя, аднаўлена экспазіцыя. Залу Кандрата Крапівы наведваюць шматлікія экскурсіі, тут праходзяць заняткі па беларускай літаратуры, віртуальныя падарожжы па старонках творчасці.

— Мы прыехалі не толькі вывучыць вопыт самых лепшых устаноў вобласці, але і прывезлі свае падарункі юным даследчыкам роднай літаратуры, — сказала **метадыст Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Наталля ОБУХАВА.** — У экспазіцыю перадаём копіі некаторых дакументаў з архіва Нацыянальнай акадэміі навук, адну з маляўнічых кніг пра Кандрата Крапіву. Спадзёмся, што наш семінар паспрыяе яшчэ больш плённым сувязям школы з сацыяльнымі партнёрамі дзеля стварэння цэнтраў музейнай педагогікі.

— Літаратары таксама робяць свой унёсак у вывучэнне і захаванне культурнай спадчыны, — зазначыла **першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ.** — У семінары ўдзельнічаюць паэты і празаікі, іх выступленні будуць цікавымі для педагогаў. Прывезеныя намі кнігі папоўняць паліцы школьнай бібліятэкі. Такія сувязі плануем падтрымліваць і далей: будзем дапамагаць юным філолагам і краязнаўцам даследаваць спадчыну Кандрата Крапівы, папулярызаваць яго творы.

Што датычыцца апошняга, то школьнікі парадавалі сваім веданнем твораў славутага земляка: дзеці падрыхтавалі інсцэніроўкі вядомых баек, чыталі вершы, танцавалі.

У памяшканні школы адначасова дэманстравалася выстаўка пейзажаў «Сцяжынкамі Кандрата Крапівы», якія стварыў мясцовы настаўнік выяўленчага мастацтва Андрэй Лычкоўскі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара**


Пад шклом вітрыны музея фотаздымкі і пісьмы Кандрата Крапівы.



Копіі некаторых дакументаў архіва Нацыянальнай акадэміі навук перадае Наталля ОБУХАВА.


Так школьнікі інсцэніравалі вядомую байку «Дзед і Баба».

■ Факт

### ЭЛЕКТРАБЯСПЕЦЫ НАВУЧАЦЬ У ШКОЛЕ

**Клас, дзе дзяцей вучаць электрабяспецы, адкрылі ў Гомелі. На базе сярэдняй школы №12 было ўладкавана спецыялізаванае абсталяванне, і цяпер тут тлумачаць карысць электрычнага тока ў быце і на вытворчасці, а таксама расказваюць пра небяспеку ўздзеяння яго на арганізм чалавека.**

У школе пачалі вучыць акуратнаму карыстанню электрапрыборамі, нагадваць пра рэальную пагрозу для жыцця пры абрыве правадоў, узлыме на апоры, пранікненні ў падстанцыі і электрычныя шчыткі. Аднак папярэджанне траўматызму — не адзіная задача ініцыятараў, а гэта філіял «Энерганагляд» РУП «Гомельэнерга». Гэты праект таксама мае на мэце правядзенне ранняй прафарыентацыйнай работы, гаворыць **начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення адукацыі Сяргей ПАРОШЫН:**

— Дзеці, магчыма, будуць зацікаўлены свядома паступаць у навучальныя ўстановы розных узроўняў па гэтым профілі. Актуальна гэта і тым, што ў нас актыўна развіваецца атамная энергетыка, якая дае магчымасць атрымліваць танную электраэнергію.

Прыцягваць да супрацоўніцтва плануюць і бацькоў. Новая аўдыторыя абсталявана спецыяльнымі дапаможнікамі, стэндамі і прыборамі. Тут у шосты школьны дзень будуць праходзіць факультатыўныя заняткі. Акрамя таго, у навучальнай установе плануецца арганізаваць добраахвотніцкі атрад юных інспектараў энерганагляду, удзельнікі якога пасля будуць дзяліцца карысным досведам з аднагодкамі з іншых школ.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

Дзяржава для народа
# Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
1 лютага 2017 г.
№ 3 (387)



стар. 3

Колькі плаціць за газавы балон?



стар. 5

Як звычайны пасёлак стаў брэндам



стар. 7

Кватэра і катэдж за... базавую велічыню

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# ЗОНА АДЧУЖЭННЯ

## Як у Брэсцкім раёне вядзецца прафілактыка афрыканскай чумы свіней



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Адна старшыня сельскага Савета — праўда, не ў Брэсцкім, а ў іншым раёне вобласці, дзе свінакомплекс уступіў у строй адносна нядаўна, — так характарызавала работу па забароне пагалоўя свіней на асабістых падворках: «Амаль да баявых дзеянняў даходзіць». Што і казаць, працэс барацьбы за чысціню хлявоў ад традыцыйных у вёсцы свіней у так званай буфернай зоне ідзе напружана. Ну што за справа ўмоўнай бабцы Мані да вашай фермы прамысловых маштабаў?! Яна прывыкла пад Каляды кабанчыка на падворку асвежаваць, ды каб унукі з горада прыехалі, ды ў сумку ім свежых каўбас: і пальцам пханай, і крывянкі, і вантрабянкі — пакласці. І так было ўсё жыццё. А тут раптам — нельга.**

стар. 4

ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

# АРЭНДУ ПАДКАРЭКЦІРАВАЛІ

## З першых дзён года змяніліся некаторыя аспекты здачы ў арэнду дзяржаўнай маёмасці і маёмасці гаспадарчых таварыстваў з доляй дзяржавы больш за 50%



**Сёлета пачынаюць дзейнічаць асноўныя палажэнні Указа кіраўніка дзяржавы № 421 ад 15 лістапада 2016 года. Як з прыняццем новага ўказа змяніцца становішча дзяржаўных і прыватных суб'ектаў гаспадарання, расказвае кансультант упраўлення па пытаннях выкарыстання дзяржаўнай маёмасці Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Аляксандр СМІРНОЎ.**

### Незарэгістраваную маёмасць — у абарот

Эксперт лічыць, што цяпер стане працей жыць тым арэндадаўцам, якія маюць незарэгістраваную дзяржаўную маёмасць. Яны атрымалі магчымасць здаваць у арэнду незарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні). Праўда, тут існуе адна ўмова: арэндадаўца павінен зарэгістраваць гэтую нерухомую маёмасць на працягу шасці месяцаў з пачатку года або ад моманту заключэння дагавора арэнды (у дачыненні да дагавораў, заключаных пасля 1 студзеня 2017 года), акрамя выпадкаў, калі яна размешчана на землях агульнага карыстання. У адваротным выпадку, пачынаючы з сёмага месяца, арэндадаўцу прыйдзецца пералічваць атрыманую арэндную плату ў бюджэт у поўным аб'ёме.

### Гараж — пад склад

Свабодней цяпер стане дзейнічаць і тым уласнікам, якія не могуць адшукаць ахвотных выкарыстоўваць маёмасць



па прызначэнні. Сёлета яны атрымалі правы здаваць у арэнду нерухомую маёмасць (якая знаходзіцца ў дзяржуласнасці або ва ўласнасці гаспадарчых таварыстваў з доляй дзяржавы больш за 50%) не па тым прызначэнні, якое пазначана ў дакументах адзінага дзяржаўнага рэгістра нерухомай маёмасці.

стар. 7

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# АД ЖЫЦЦЯ І ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

**Мікалай МАРТЫНАЎ у Савеце Рэспублікі ўжо чацвёртае скліканне. Працуе ў пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Бізнесмен, адзін з самых паспяховых прадпрымальнікаў, генеральны дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кіруючая кампанія холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка».**



Сенатар — член рэспубліканскага Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Прэзідэнце. Добра вядомы і як мецэнат. Дапамагае дзіцячым дамам, установам, дзе пражываюць састарэлыя, удзельнічае ў аднаўленні храмаў...

Падкрэслівае, што сенатары «не адарваныя» ад жыцця. Яны ведаюць, што турбуе землякоў падчас сустрэч. А як практыкі ўносяць папраўкі ў законы, каб пры іх прымяненні быў максімальны эфект.

## Аб чым просяць сенатара?

Мікалай Мартынаў першы раз быў вылучаны ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу ад Віцебска. А потым — ад Докшыцкага, Пастаўскага і Глыбоцкага раёнаў. На «грамадскіх пачатках» стараецца дапамагчы роднаму Дубровенскаму. Канстатуе, што ў асноўным да яго звяртаюцца па дапамогу як да бізнесмена.

— Людзі ведаюць: калі ёсць магчымасць — не адмоўлю. Пенсіянеры просяць аказаць фінансавую падтрымку ў рамонце прыватнага дома, агароджу заняміць... Трэба пасадзейнічаць — калі ў іх няма дзяцей або яны вельмі далёка ад іх жывуць. А калі параўнальна побач, дык няўжо не могуць тую ж агароджу паправіць? Але стараюся пайсці насустрач.

Перыядычна бываюць індывідуальныя просьбы, якія не патрабуюць фінансавай дапамогі. У прыватнасці, накont месца ў інтэрнаце, дзіцячым садку, працаўладкаванні...

Ёсць і калектыўныя звароты — людзі прасілі дапамагчы ў газіфікацыі вёскі, адрамантаваць дарогу, добраўпарадкаваць вуліцу. Сенатар разам з кіраўнікамі мясцовай улады вывучае пытанні. А потым ужо прымаецца рашэнні.

— А жыхароў Пастаў турбуе, што ў сувязі з павелічэннем колькасці насельніцтва статус населенага пункта мяняецца. Вядома, што ў так званых малых гарадах, напрыклад, больш прывабныя ўмовы па крэдытаванні для будаўніцтва жылля. А змяненне статусу пагаршае магчымасць атрымаць «дывідэнды» ад пражывання ў ім. Лічу гэтую тэму важнай. Яна патрабуе дадатковага вывучэння і маніторынгу, — працягвае суразмоўца.

## Каб спрыяць бізнесу...

Ды і для прадпрымальнікаў у глыбінцы вялікія прэферэнцыі. Іх пералік не раз агучваўся ў СМІ. Напрыклад, няма падатку на прыбытак на працягу 5 гадоў, на зямлю, добрыя ўмовы для інвестараў.

Мікалай Мартынаў лічыць, што менавіта па-за межамі вялікіх гарадоў вельмі выгадна пачынаць сваю справу, каб зарабіць стартавы капітал і сэканоміць на падатках.

— Наш холдынг таксама адкрыў вытворчы цэх у Лёзненскім раёне. Каля 20 мясцовых жыхароў робяць дэталі абутку. Плануецца пашырыць аб'ёмы вытворчасці. Тым больш што плошчы дазваляюць. Раней у тым будынку знаходзіліся атэлье, цэхі камбіната бытавога абслугоўвання... Але, калі адкрыць аналагічны ў Паставах, нам па лагістыцы гэта нявыгадна: далёка, транспартныя выдаткі будуць з'ядаць усе магчымыя дывідэнды. Там плануем, як і ў некалькіх іншых райцэнтрах, распачаць фірменны гандаль. Адпаведна хай і нямнога, але створым новыя працоўныя месцы, — гаворыць Мікалай Мартынаў.

Гаворачы пра ўмовы для бізнесу, ён канстатуе, што адпаведнае заканадаўства ў нас на добрым узроўні. І падаткі значна ніжэйшыя, чым у ЕС. Але ёсць «дробязі», якія практыкі ведаюць, а распрацоўшчыкі законаў — не. Да таго ж, лабіруюць свае інтарэсы міністэрствы і ведамствы, але не ўлічваюць усе нюансы. Ды і на месцах дапамога бізнесу нярэдка знаходзіцца на ўзроўні дэкларавання. Або няма разумення: чым рэальна трэба дапамагаць...

— У прыватнасці, прапаноўваюць для бізнесу будынкі прадпрыемстваў, прызнаных банкрутамі, або збудаванні — праз аўкцыёны. Так, па прывабных цэнах, нават за базавую велічыню. Але ў большасці выпадкаў бізнесмену прасцей нешта будаваць з нуля. Напрыклад, я вывучаў нямецкі, італьянскі, турэцкі вопыт... Там, для таго каб ствараць новыя прадпрыемствы, вылучаецца ўчастак зямлі, да якога падведзеныя камунікацыі. І можна будаваць з сучасных матэрыялаў, улічваючы патрабаванні МНС, санітарна-гігіенічнай службы...

## Без бюракратызму і валакіты

Сёлета савет па развіцці прадпрымальніцтва і адпаведная рабочая група, створаная па распараджэнні Прэзідэнта, павінны з удзелам зацікаўленых адказных асоб выпрацаваць прапановы. Кіраўнік дзяржавы нядаўна патрабаваў перастаць «кашмарыць» бізнес. Таму і трэба агучыць «балючыя тэмы», каб не было прабелаў у заканадаўстве, каб праблемныя пытанні не мусоліліся, а абмяркоўваліся.

— Нешта ў заканадаўстве трэба дапоўніць, іншае — змяніць або выключыць. Прэзідэнт разумее ўсю важнасць такіх напрацовак. Неабходна паскорыць паляпшэнне заканадаўчай базы. І гэтая камісія павінна працаваць, каб было меней бюракратызму, валакіты... Каб потым менш было парушэнняў пры выкананні законаў. Не заўсёды прававыя акты трэба прымаць хутка — лепш распаўсюджваць для шырокага абмеркавання. Я пра дырэктараў буйных прадпрыемстваў, прадстаўнікоў бізнес-структур, вопытных прадпрымальнікаў. Яны павінны ўносіць свае пажаданні. А члены камісій сената і дэпутаты павінны быць аб'ектыўнымі. Паўтаруся: часам ведамствы клапоцяцца толькі пра свае інтарэсы, але не ўлічваюць усе нюансы, — разважае Мікалай Мартынаў.

> На месцах дапамога бізнесу нярэдка знаходзіцца на ўзроўні дэкларавання. Або няма разумення: чым рэальна трэба дапамагаць...

## Законы на будучыню

Мікалай Мартынаў расказаў пра законы, якія былі зацверджаны летась і над якімі вядзецца работа.

— У 2016 годзе былі, у прыватнасці, прыняты законы аб выканаўчай вытворчасці, аб судовых выканаўцах. Упершыню гэта сфера ўрэгулявана самастойнымі законамі. Раней былі прапісаны толькі асобныя нормы кодэксаў і падзаконныя нарматыўныя акты. Гэта важна, паколькі сістэма прымусовага выканання судовых рашэнняў недастаткова эфектыўная... Замацавалі новую ваенную дактрыну, якая адпавядае сучасным небяспечным выклікам. Прынялі Кодэкс аб культуры, Закон аб прамысловай бяспецы. Унеслі змяненні ў шэраг кодэксаў. У тым ліку і той, які тычыцца адміністрацыйных правапарушэнняў. У прыватнасці, усталявалі адказнасць за парушэнне конкурсных працэдур пры будаўніцтве і дзяржаўных закупках, — нагадаў сенатар.

Сёлета рыхтуецца да разгляду Закон «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі» (у новай рэдакцыі), змены і дапаўненні ў Закон «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй». Запланаваныя і змены ў Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў»...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

# КАБ БЫЛІ ЗДАРОВЫМІ

## Рыхтуецца законапраект пра якасць харчовай сыравіны



Фота БЕЛТА.

**Калі заканчваецца сесія ў парламенце, дэпутаты, вядома, працягваюць працаваць. Па іх словах, работы ў міжсесійны перыяд становіцца нават больш. Акрамя штомесячнай працы ў акрузе, трэба рыхтаваць да разгляду ў Авальнай зале законапраекты. Праходзяць пасяджэнні рабочых груп, пастаянных камісій, каб вынікову дакумент меў мінімум «нестыковак».**

**Валянцін МІЛАШЭЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы,** зараз займаецца дакументам, што ўносіць змены і дапаўненні ў Закон «Аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і бяспекі чалавека».

— Законапраект ідзе вельмі цяжка, — дзеліцца ён сваімі меркаваннямі. — Мы працуем над ім ужо больш за два гады. Натуральна, за гэты час змянілася міжнародная нарматыўна-прававая база, уступіў у сілу Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе...

Па словах парламентарыя, узнікае шмат, на першы погляд, дробязных пытанняў.

— Але яны сапраўды важныя для здароўя чалавека, — адзначае Валянцін Мілашэўскі. — Сёння, купляючы любы прадукт харчавання, нямногія людзі глядзяць нават на тэрмін яго прыдатнасці, не кажучы ўжо пра тое, што ўваходзіць у склад. А часам у склад прадуктаў, афіцыйна дапушчаных да вытворчасці, уваходзяць дабаўкі, фарбавальнікі, якія на пэўным этапе шкодныя для здароўя чалавека. Мы ведаем, што ў многіх ёсць алергічная скіраванасць арганізма на той ці іншы прадукт. Не прачытаўшы, што ўваходзіць у склад, можна атрымаць абвастрэнне захворвання.

Як расказаў дэпутат, у заканатворцаў ёсць шмат пытанняў: што і як пісаць на ўпакоўках, якім шрыфтам.

— Мы працуем з многімі аднатыпнымі законамі іншых дзяржаў. Некаторыя прапануюць такі шрыфт, каб можна было прачытаць склад прадукта без акуляраў. Але як на абгортцы глазіраванага сырка напісаць такімі літарамі, каб можна было са зрокам 50% прачытаць? Натуральна, так не напішаш, бо сама ўпакоўка маленькая.

Тым не менш неабходная інфармацыя спажыўцу павінна прадастаўляцца.

— Калі ў гэтым прадукце ёсць нейкія інгрэдыенты, генна-мадыфікаваныя арганізмы з колькасцю больш за 0,9% ад усяго складу, гэта абавязкова будзе ўказана, — падкрэсліў Валянцін Мілашэўскі.

Што да цаны, то сёння кошт прадуктаў харчавання залежыць ад многага. Натуральна, у першую чаргу ад таго, наколькі яны экалагічныя.

Адказваючы на пытанне, ці звязаны законапраект з экспартам беларускай прадукцыі і ці можа яго прыняцце дапамагчы справіцца з прэтэнзіямі да яе якасці, Валянцін Мілашэўскі падкрэсліў, што дакумент улічвае падпісанне Дагавора аб ЕАЭС.

— Нарматыўна-прававыя акты, міжнародныя дагаворы па сіле вышэйшыя, чым нашы ўнутраныя дамоўленасці, — звярнуў увагу ён. — Сёння адбываецца рэалізацыя заканадаўства Еўразійскага эканамічнага саюза на нашай глебе — каб не было рознагалосся. Калі сёння наш прадукт харчавання, які пойдзе на экспарт, будзе адрозніваецца ўпакоўкай, надпісам, складам — яго проста не прымуць на іншых рынках. Безумоўна, нашым вытворцам — пачынаючы ад індывідуальных прадпрымальнікаў і заканчваючы буйнымі кампаніямі — неабходна адпавядаць міжнародным нарматывам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

# З ВЯСКОВАЙ ПРАПІСКАЙ — ТАННЕЙШЫ ГАЗ

## Праз адсутнасць рэгістрацыі пенсіянер можа ў тры разы пераплаціць за балон паліва

**Рэгістрацыя, ці па-колішняму прапіска, для сучасных беларусаў — простая фармальнасць. Людзі сталі надзвычай мабільнымі і актыўна пераязджаюць з месца на месца. Часцей за ўсё ў пошуку лепшай працы. І работадаўцаў даўно не хвалюе, якая «клякса» стаіць у тваім пашпарце. Ніхто не пераядае табе нервы, калі ты прапісаны ў «глухмені», а працуеш у сталіцы. Няма патрэбы купляць «ліпавую» рэгістрацыю. І праваахоўнікі, правяраючы твае дакументы, не прыглядаюцца падазрона да «панаехаўшай» фізіяноміі. Жыві дзе хочаш, працуй дзе хочаш. Дэмакратыя! А рэгістрацыя — справа дзясятая. Ёсць — і добра. Але здараюцца выпадкі, калі адсутнасць рэгістрацыі балюча б'е па кішэні.**



Калі моладзь імкнецца ў буйныя гарады, то пенсіянеры наадварот — асвойваюць вясковыя абшары. На схіле свайго веку многія адчуваюць цягу да зямлі, да сялянскіх каранёў. Усё часцей пажылыя гараджане пераязджаюць у вёскі, дзе жыццё спакайнейшае і паветра здаравейшае. Плюс прыемны бонус у выглядзе агурочкаў з уласнага гарода. Вось і наш сталы чытач Уладзімір Сідар у свой час перабраўся з Гродна ў вёску Шчэчыцы Мастоўскага раёна. І не шкадуе аб гэтым. «Я сам родам з вёскі, — тлумачыць Уладзімір Мікалаевіч, — і мне тут даспадобы. Купіў хату, завёў невялічкую гаспадарку. Пенсія хоць і не надта вялікая, але на пражыццё хапае».

Дый вясковая хата — гэта не гарадская кватэра. Тут ты сам сабе цар, бог і начальнік ЖЭУ. Вады нанасіў, печку напаліў — поўная жыллёва-камунальная аўтаномія. Адно што за святло і газ плаціць даводзіцца. Акурат цана блакітнага паліва і азмрочыла вясковую ідылію пенсіянера Сідара. «Спачатку плаціў за балон звадкаванага газу крыху больш за адзінаццаць рублёў, — расказвае Уладзімір Мікалаевіч, — а ў студзені 2017-га, калі чарговы раз заказаў дастаўку балона, мне сказалі, што газ цяпер для мяне каштуе практычна ўтрая даражэй. Высветлілася, што паводле нейкага закона я мушу аплачваць поўны кошт, бо зарэгістраваны ў Гродне. Хоць у горадзе даўно не жыву, бо купіў хату ў Шчэчыцах. Яна на мяне афіцыйна аформленая як жылы дом. І ў сельсавеце могуць пацвердзіць: у мяне тут гаспадарка. Я даўно ўжо тутэйшы жыхар!»

Чаму так адбываецца? З гэтым пытаннем наш чытач звярнуўся ў рэдакцыю. У Лунненскім сельвыканкаме нам патлумачылі, што Уладзімір Сідар такі не адзін. «Многія пенсіянеры, пераязджаючы з горада на вёску, захоўвалі сваю гарадскую рэгістрацыю, — тлумачыць **кіраўнік спраў Лунненскага сельвыканкама Вольга КАРАНЕЎСКАЯ.** — Гэта давала пэўныя перавагі. Так, яны па-ранейшаму абслугоўваліся ў гарадскіх паліклініках, мелі льготы па аплаце камунальных паслуг у горадзе. Але цяпер падыход больш строгі: нельга атрымліваць ільготу ў двух месцах адначасова. Даводзіцца вызначацца. І прыезджыя пенсіянеры сталі масава рэгістравацца на тэрыторыі нашага сельсавета».

«Парушэння тут няма, — патлумачылі нам у службе рэжымаў газазабеспячэння і ўліку расходу газу прадпрыемства «Гроднааблгаз». — Мы дзейнічаем згодна з Пастановай Савета Міністраў № 571. Паводле гэтага дакумента, калі ўласнік жылплошчы зарэгістраваны па месцы жыхарства, ён мае права набываць газ па субсідаваным кошце. На цяперашні час гэта 11 рублёў 31 капейка за балон. Калі ж ні сам уласнік, ні члены яго сям'і рэгістрацыі на гэтай жылплошчы не маюць або маюць рэгістрацыю па месцы знаходжання, мы мусім прадаваць ім газ па тарыфах, што цалкам пакрываюць эканамічна абгрунтаваныя выдаткі. А гэта ўжо 31 рубель 52 капейкі».

А цяпер перакладзём інфармацыю з канцылярска-заканадаўчай мовы на зразумела-бытавую. Калі вы або вашыя сямейнікі зарэгістраваныя ў хаце, то газ вам прададуць па субсідаванай цане (11 руб. 31 кап.). Калі ж месцам рэгістрацыі пазначаны іншы населены пункт, то раскрывайце шырэй кішэнь. Бо плаціць давядзецца поўны кошт...

Патлумачылі ў «Гроднааблгазе» і сітуацыю, у якую трапіў наш чытач. Так, спачатку ў прадпрыемства не было звестак аб тым, што Уладзімір Мікалаевіч не зарэгістраваны ў Лунненскім сельсавеце. Таму і газам яго забяспечвалі як мясцовага жыхара. Але інфармацыя з пэўнай перыядычнасцю абнаўляецца. І калі сельвыканкам даслаў свежыя звесткі, высветлілася, што наш чытач мае рэгістрацыю гарадскую. І згодна з заканадаўствам страціў права на «льготны» газ у Шчэчыцах....

У выніку праблема вырашылася проста: Уладзімір Мікалаевіч зарэгістраваўся ў вёсцы і цяпер можа купляць газ за 11 з капейкамі рублёў. Праўда, давялося пахадзіць па інстанцыях, бо рэгістрацыя аказалася не проста фармальнасцю: да яе дагэтуль «прывязаныя» льготы, субсідыі і нормы. Таму прэтэнзій да газавікоў няма: як у законе прапісана — так і дзейнічалі. І ўвогуле сітуацыя даволі тыповая і вырашаецца ў рабочым парадку.

Што рабіць грамадзянам, каб пазбегнуць падобных казусаў? Пры змене месца жыхарства прымаць да ўвагі, што фокус з субсідаваннем адразу дзвюх жылплошчаў не спрацуе. Таму ўласнікам двух і болей дамоў або кватэр варта ўзяць калькулятар і скрупулёзна падлічыць выгады і страты. І ў адпаведнасці з гэтым прыняць рашэнне аб рэгістрацыі. А дзяржаўная логіка тут даволі ясная: адна жылплошча — неабходнасць. Адпаведна атрымайце льготы і субсідыі на камунальныя паслугі. А дзве і болей — гэта ўжо патэнцыяльная крыніца прыбытку або капіталаўкладанне. Таму навяўленыя пажылыя вяскоўцы ўсё часцей здаюць свае гарадскія кватэры ўнаём. І маюць з гэтага дадатковы даход. Ці пасяляюць у іх блізкіх сваякоў. А самі выбіраюць няспешлівасць і спакой вясковага жыцця. Разам са «скідкамі» на газавыя балоны.

**Валянцін БОЙКА.** boika@zviazda.by

АБМЯРКУЕМ

# Раз паперка, два паперка

## Як у сельсаветах спраўляюцца з дакументаабаротам

**«Вусы, лапы, хвост — вось мае дакументы», — гаварыў кот Матроскін. Эх, каб усё было так проста ў людзей! На справе ў сельвыканкамах работа кіпіць: выдача даведак, улік выбаршчыкаў, рэгістрацыя па месцы жыхарства, падворны ўлік... Спраўляцца з усімі гэтымі паперамі дапамагаюць спецыяльныя праграмы і новыя тэхналогіі, якія паступова ўводзяцца ў работу на месцах. Але ў некаторых выканкамах застаецца запатрабаванай і пісьмовая дакументацыя, якую па-старому запаўняюць ад рукі. Мы правялі апытанне і высветлілі, як працаваць лепш.**

У Крупаўскім сельсавеце Лідскага раёна нам расказалі, што больш давяраюць журналам. Электронныя праграмы, вядома, робяць працу хутчэйшай і лягчэйшай, да таго ж там ёсць доступ да базы, дзе можна знайсці некаторыя падказкі. Але журналы больш надзейныя. Яны спецыяльна захоўваюцца, і ёсць упэўненасць, што інфармацыя не знікне. **Старшыня Губіцкага сельскага Савета дэпутатаў Буда-Кашалёўскага раёна Лілія ТАРМАНАВА** таксама падзялілася з намі ўласным вопытам:

— Мы не так даўно далучыліся да сістэмы электроннага абароту дакументацыі. Спадзяёмся, што гэта палегчыць працу. Зараз вядзём журналы, выкарыстоўваем праграмы АІС (Аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «Мясцовыя Саветы дэпутатаў». — **Аўт.**) і ЛАІС (Лакальная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма органаў мясцовага кіравання і самакіравання першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню. — **Аўт.**). Яны дапамагаюць нам ствараць даведкі ўстаноўленага ўзору, фарміраваць справаздачы, праводзіць рэгістрацыю грамадзян. Праграмы памяншаюць час на абслугоўванне, грамадзяне менш сядзяць у чэргах. І можна аператыўна ўносіць праўкі, калі трэба. Мы задаволены: гэта зручна. А ў бухгалтэрыі ў нас таксама свая праграма — 1С.

**Старшыня Галубіцкага сельскага Савета дэпутатаў Глыбоцкага раёна Пётр СУПРАНЁНАК** адзначыў, што развіццё тэхналогій ідзе наперад, праграмы паляпшаюцца, але ўсё ж такі без журналаў нікуды. Цяпер работа пастаўлена даволі эфектыўна, таму пра далейшае спрашчэнне дакументаабароту размова пакуль не ідзе.

У Бярэзінскім сельсавеце Мінскай вобласці вельмі задаволены камп'ютарнымі праграмамі — стала прасцей працаваць. Па-першае, не трэба дарэмна траціцца на канверты, па другое — адказ ідзе значна хутчэй. Раней трэба было чакаць, пакуль пісьмо дойдзе, а цяпер час запыту скараціўся. Гэта эфектыўна, але для таго, каб сістэма добра працавала, патрэбна якасная тэхніка. Зараз пад праграмы дакументаабароту ў гэтым сельсавеце выкарыстоўваюцца два камп'ютары, бо «адзін усё не пацягне».



«У нас дакументаабарот, мабыць, нават павялічыўся», — гаворыць **старшыня Дамачоўскага сельскага Савета дэпутатаў Брэсцкага раёна Уладзімір ХВАЦІК.** Раней, каб напісаць пісьмо, трэба было звяртацца да канкрэтнага чалавека, збіраць усё ў канверт, ісці на пошту... Цяпер электронны дакумент дасылаць прасцей: ён прыходзіць у выканкам — і яго перадаюць пэўнаму спецыялісту. Але з-за спрашчэння гэтай працэдуры атрымліваем лістоў і дакументаў больш.

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by

ТОЛЬКІ ФАКТЫ

## НА ПАЖАРЫ ВЫРАТАВАЛІ ТРАІХ ЧАЛАВЕК

### За два дні кватэра гарэла тройчы

**Бліжэй да вечара сталічным выратавальнікам ад суседзяў паступіла паведамленне аб пажары ў доме на вуліцы Даўгабродскай.**

Калі праз чатыры хвіліны падраздзяленні прыбылі на месца, назіраўся дым з акна кватэры на пятым паверсе. Работнікі МНС выратавалі гаспадыню суседняй кватэры, 1931 года нараджэння, якая знаходзілася на лесвічнай клетцы сёмага паверха ў беспрытомнасці. Пацярпелая была перададзена брыгадзе хуткай дапамогі і з атручваннем прадуктамі гарэння, апёкамі абедзвюх кісцяў, передплеччаў, твару першай-другой ступеняў (5 працэнтаў паверхні цела) дастаўлена ў бальніцу, паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС. З кватэры на шостым паверсе, дзе мелася задымленне, з дапамогай масак былі выратаваны жанчына, 1973 года нараджэння, і яе дачка, 2010 года нараджэння.

Пажар быў аператыўна лакалізаваны і ліквідаваны. Агнём пашкоджана маёмасць у кватэры, закураны пад'езд з 5 па 7 паверхі. Прычына здарэння высвятляецца, разглядаецца версія неасцярожнасці пры курэнні брата гаспадыні жылля (на момант пажару дома адсутнічаў). Работнікі МНС ужо тройчы прыбывалі па гэтым адрасе. Першыя два разы — за дзень да апошняга здарэння. Першы раз падгарэла ежа, пакінутая на пліце без нагляду, другі — з-за тлення абшыўкі крэсла.

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ СПІС АГАРОДНІНЫ,

### цэны на якую рэгулююцца не больш за 90 дзён на працягу года

**Зацверджаны пералік сацыяльна значных тавараў, цэны на якія рэгулююцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам не больш за 90 дзён на працягу аднаго года. Гэта замацавана пастановай Савета Міністраў ад 27 студзеня 2017 года №81.**

У пералік увайшлі свежая бульба, буракі і морква сталовыя, капуста белакачанная, цыбуля. Пры гэтым да сацыяльна значных тавараў, цэны на якія рэгулююцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам не больш за 90 дзён на працягу аднаго года, не адносяцца свежая бульба, буракі і морква сталовыя адкаліброваныя, мытыя, расфасаваныя ў перфараваныя пакеты і сеткаватую тару з ужываннем кліпсатара. Пастанова прынята ў адпаведнасці з Указам ад 25 лютага 2011 года №72 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання цэн (тарыфаў) у Рэспубліцы Беларусь» і Пратаколам аб агульных прынцыпах і правілах канкурэнцыі (дадатак №19 да Дамовы аб Еўразійскім эканамічным саюзе ад 29 мая 2014 года). Дакумент уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
rs@zviazda.by

# ЗОНА АДЧУЖЭННЯ

### Адна супраць дзевяноста тысяч

— І бабку шкада, асабліва, калі заходзіш на падворак, а яна ледзьве не галосіць. Але ж нічога не зробіш. Не вартая адна свіння пагалоўя колькасцю 90 тысяч, — гаворыць **намеснік галоўнага ўрача ветэрынарнай станцыі Брэсцкага раёна Аксана ЧАПУЛЯНЕЦ.** — Менавіта столькі сёння налічваецца на свінаводчым комплексе «Заходні», які размешчаны на тэрыторыі Матыкальскага сельсавета. Тут жа, дарэчы, ёсць яшчэ адна свінаферма, хоць у дзясяткі разоў меншая — пагалоўе сялянска-фермерскай гаспадаркі «Прыбужскае» ў вёсцы Чылеева вымяраецца недзе дзвюма тысячамі.

Як вядома, і ў нашай краіне фіксаваліся асобныя выпадкі афрыканскай чумы свіней (АЧС), і ў суседніх дзяржавах такія ўспышкі адбываюцца рэгулярна, таму і прымаюцца асаблівыя меры бяспекі. Пастановай Савета Міністраў ад 28 жніўня 2013 года зацверджана ўсталяванне буфернай зоны вакол свінагадоўчых комплексаў — гэта значыць, тэрыторыі, на якой разводзяць свіней у прыватным сектары забараняецца. Пазней прымаліся і ўдакладняліся іншыя нарматыўныя дакументы па названай тэме. Сённяшняя буферная зона Брэсцкага раёна ўстаноўлена на падставе рашэння райвыканкама, якое было прынята два гады таму, у студзені 2015 года. Такім чынам, у зону забароны свіней трапіла дзевяць вёсак Матыкальскага сельсавета: Вялікія і Малыя Матыкалы, Нехалсты, Вялікая і Малая Ракавіца, Чылеева, Заполле, хутары Матыкалы і Збарамірава, а таксама пяць вёсак суседняга Лышчыцкага сельсавета: Малыя Шчытнікі, Лышчыцы, Новыя Лышчыцы, Астрамечава, Кашылава. Гэта тэрыторыя з насельніцтвам у невялікі райцэнтр. Таму работа па прафілактыцы праводзіцца вялікая.

> Вядома, групе спецыялістаў, якая ходзіць па падворках, не пазайздросціш. Службовым асобам даводзіцца чуць у свой адрас і пагрозы, і праклёны.

**Галоўны ветэрынарны ўрач раёна Сяргей КУПРЫЯНАЎ** паведамляе, што пачыналі, вядома, з асветы і тлумачэнняў. Найперш праз сродкі масавай інфармацыі паведамлялі сельчанам пра небяспеку і каварнасць афрыканскай чумы свіней, якая ў лічаныя дні здольная выкасіць любое па колькасці пагалоўе жывёлы. Абараніць ад захворвання прыватную свінку практычна немагчыма. Вірус перадаецца найперш праз кармы, якія не прайшлі дастатковую цеплавую апрацоўку, а значыць, прыгатаваныя ў хатніх умовах. Менавіта кармы тояць у сабе галоўную пагрозу. Любое кукурузнае поле сёння могуць наведаць дзікі, якія пакінуць на ім адходы сваёй жыццядзейнасці, і корм з кукурузы становіцца патэнцыяльна небяспечным. Яшчэ вірус пераносяць грызуны: мышы, пацукі. І калі пагалоўе дзікоў у лесе хоць бы ўмоўна кантралюецца, то дробных разносчыкаў заразы кантраляваць немагчыма. Яны могуць пагрызці караняплод, а таксама пранікнуць у любы прыватны хлеў і паесці са свінога карыта, і гэтага будзе дастаткова для перадачы віруса. Таму выхад застаецца толькі адзін — не трымаць свіней.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Ад асветніцкай гутаркі да санкцыі пракурора

У вёсках найперш правялі сельскія сходы, на якіх, як няцяжка здагадацца, людзі не выказалі захаплення ад новых парадкаў вядзення прыватнай гаспадаркі. Але былі ўстаноўлены канкрэтныя тэрміны, і працэс увасаблення ў жыццё рашэння выканкама пайшоў. Нельга сказаць, што ўсе і адразу пазбавіліся ад прывычных у гаспадарцы парсючкоў.

У раёне створана рабочая група па абходу асабістых падворкаў грамадзян, якія пражываюць у буфернай зоне. У яе склад увайшлі прадстаўнікі ветстанцыі, райаддзела па надзвычайных сітуацыях, РАУС, ЖКГ, занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі і абодвух сельвыканкамаў. Раз у квартал названая група абходзіць падворкі вяскоўцаў.

— Гэтыя рэйды спачатку людзі ўспрымалі напружана, зараз ставяцца з большым разуменнем, — расказвае Аксана Чапулянец. — Рэйды ў большасці сваёй носяць асветніцкі характар, з вяскоўцамі гутараць, нагадваюць аб неабходнасці вымушаных мер. А гаспадарчыя пабудовы спецыялісты аглядаюць на прадмет утрымання свіней толькі са згоды грамадзян. Калі ж ёсць папярэдняя інфармацыя, што, напрыклад, пэўны грамадзянін парушае забарону, тады бярэцца санкцыя пракурора. Даводзіцца прыбягаць і да такіх спосабаў агляду.

На жаль, парушэнні раз-пораз выяўляюцца. Так за 2016 год было прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці пяць чалавек. У якасці спагнання за парушэнне забароны прадугледжана ад папярэджання да штрафу у памеры ад адной да 20 базавых велічынь. У кожным канкрэтным выпадку прымяняецца пэўная мера адказнасці. Бывае, выяўлена адна «крымінальная» свінка ў хляве, знаходзілі і некалькі свінаматак з парасятамі ў адной з гаспадынь, як гэта здарылася летась.

Вядома, групе спецыялістаў, якая ходзіць па падворках, не пазайздросціш. Службовым асобам даводзіцца чуць у свой адрас і пагрозы, і праклёны. І яшчэ аб адной непрыемнай рэчы расказалі ў рабочай групе. Здараюцца прыкрыя выпадкі, калі адзін сусед хоча «пажартаваць» над другім і ананімна заяўляе пра парушэнне ім забароны. Кампетэнтныя асобы прыязджаюць на месца, а там нічога няма, значыць, выклік фальшывы. Калі такія «жартаўнікі» будуць выяўлены, яны панясуць адказнасць.

### Ці таварыш гусь свінні?

Многія людзі, як ужо гаварылася, хваравіта ўспрынялі забарону. У пачатку кампаніі па ўсталяванні буфернай зоны было нямала зваротаў у органы ўлады, на прамыя лініі, у тым ліку да старшыні аблвыканкама. І кіраўнік вобласці заўсёды падкрэслівае, што забараняючы, трэба прапаноўваць сельскім гаспадарам нейкую альтэрнатыву.

**Старшыня Лышчыцкага сельскага Савета Іна ДЗЯЧЭК** расказала, што з самага пачатку мясцовая ўлада прапаноўвала сялянам пераключыцца на птушкагадоўлю. У першы год забароны, успамінае Іна Анатолеўна, дамовіліся з Мінскай птушкафабрыкай і прадалі ў Лышчыцы больш за тры тысячы куранят. Налета ахвотных купляць маладняк курэй стала менш, людзі самі сталі вызначаць прыярытэты падсобнай гаспадаркі, хто пераключыўся на трусагадоўлю, хто стаў разводзіць бройлерных індыкоў. Цяпер купіць маладняк не праблема, прыватныя гандляры па заяўцы прывязуць колькі захочаш куранят ці індычанят.

У буферную зону трапілі дзве найбуйнейшыя вёскі сельсавета — Астрамечава і Новыя Лышчыцы з насельніцтвам каля трох тысяч чалавек. Вядома, былі праблемы, і не малыя. «Але некаторыя гаспадары ўжо пераключыліся на развядзенне іншай жыўнасці і не скардзяцца», — кажа старшыня сельвыканкама.

> Пастановай Савета Міністраў ад 28 жніўня 2013 года зацверджана ўсталяванне буфернай зоны вакол свінагадоўчых комплексаў — гэта значыць, тэрыторыі, на якой разводзіць свіней у прыватным сектары забараняецца.

**Уладзімір ЛЕТАШКОЎ, старшыня Матыкальскага сельскага Савета** паведаміў карэспандэнту газеты, што ў 10 населеных пунктах сельсавета прыватнікі могуць разводзіць свіней, дзевяць вёсак, у тым ліку Матыкалы, трапілі пад забарону. Апошнім часам тут паспяхова разводзяць курэй, гусей, індыкоў, качак, крыху займаюцца трусагадоўляй.

— Раней, — адзначыў кіраўнік мясцовай улады — тая самая ўлада настойліва прапаноўвала грамадзянам набываць маладняк свіней, а цяпер сталі забараняць. Вядома, былі і скаргі, і нараканні, і незадаволенасць, першая хваля якіх, на шчасце, схлынула. Праводзім работу, тлумачым, — расказвае Уладзімір Мікалаевіч. — Што значыць адным вірусам знішчыць пагалоўе «Заходняга»? Гэта не толькі велізарныя эканамічныя страты, гэта больш за тысяча чалавек без працы і сродкаў да існавання, у тым ліку іх сваякі і аднавяскоўцы. Комплекс знаходзіцца за пяць кіламетраў ад Матыкалаў. Сюды, дарэчы, сельгаспрадпрыемства перанесла свой фірменны магазін, дзе прадукцыя прадаецца крыху танней, чым у іншым рознічным гандлі.

А адну даўнюю праблему Матыкалаў, можна сказаць, вырашыла забарона. Тут вельмі шчыльная забудова, горад побач, але ж гэта ўсё роўна вёска. І шэраг гаспадароў займаліся вясковым промыслам — свінагадоўляй. У некаторых колькасць парасят даходзіла да 50—70. Можна сабе ўявіць, як было пры гэтым суседзям — летам вокны адкрыць нельга. Таму бясконцымі сталі скаргі, а то і разборкі з удзелам сельвыканкама... Цяпер праблема вырашылася аўтаматычна. Гаспадары цяпер разводзяць курэй ды гусей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
yackevich@zviazda.by
*Брэсцкі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

**Афрыканская чума свіней (АЧС), або хвароба Мантгамеры — высокакантагіёзная вірусная хвароба свіней. Вядома больш за 100 гадоў. Лячэння ад яе не існуе. Пры заражэнні ўсё пагалоўе знішчаецца і спальваецца. У Беларусі афіцыйна зарэгістраваны выпадкі АЧС у 2013 годзе на тэрыторыі вёскі Чапунь Іўеўскага раёна і ў філіяле «Лучоса» ААТ «Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў». У красавіку 2013 года ў Баранавіцкім раёне на комплексе «Усходні» было знішчана 20 000 свіней. Афіцыйна аб'яўлена пра захворванне на рэпрадуктыўна-рэспіраторны сіндром свіней, хоць чуткі хадзілі менавіта пра афрыканскую чуму.**

**Пастаянна з'яўляецца інфармацыя пра новыя зарэгістраваныя выпадкі падзяжу свіней ад афрыканскай чумы ў Расіі, Украіне, Польшчы, краінах Балтыі.**

# ПАСЁЛАК СТАНОВІЦЦА БРЭНДАМ

**Глуша ў Бабруйскім раёне — невялічкая кропка на карце, але яе напрацоўкамі карыстаюцца ва ўсёй краіне**

**Каб было зразумела, спачатку крыху гісторыі. Цэнтрам жыцця пасёлка доўгі час быў шклозавод (які заснаваў яшчэ ў XIX стагоддзі прадпрымальны памешчык). Большасць тутэйшых жыхароў з'яўлялася работнікамі прадпрыемства, і калі ў канцы 90-х яно абанкруцілася, для Глушы пачаліся па-сапраўднаму цяжкія дні. Але, як паказаў вопыт, выйсце можна знайсці нават з такой складанай сітуацыі. Была б ініцыятыва.**

## Звярталіся па дапамогу нават да міністра

Марыя Сушчанка вельмі добра памятае той перыяд, бо менавіта ёй з 2007 года даверылі ўзначаліць у Глушы мясцовую ўладу. Адчай, трывога, разгубленасць — гэтыя словы, як ніякія іншыя, характарызавалі настрой, які тады панаваў сярод насельніцтва. Работы не было, народ ехаў на заробкі ў Расію, некаторыя з'язджалі зусім.

Узніклі цяжкасці з вывазам смецця, некаторыя стыхійныя звалкі па памерах нагадвалі міні-палігоны. «Адзін такі мы вывозілі аж некалькі дзён», — успамінае Марыя. Інфраструктура пасёлка хутка прыходзіла ў заняпад. Без шклозавода, які раней быў гарантам усіх сацстандартаў для насельніцтва, не працавалі сістэма ацяплення і водазабеспячэння. Асабліва цяжка было зімой. Аварыйныя брыгады не паспявалі выязджаць на ліквідацыі парываў. Скаргі сыпаліся адна за адной. У некаторых кватэрах падчас маразоў слупок тэрмометра падаў да катастрафічных 10 градусаў. Толькі мадэрнізацыя кацельнай і цеплатрасы, рэканструкцыя жыллёвага фонду дапамаглі зняць гэту праблему. «Усё было вельмі складана, гатовых рашэнняў не існавала. Даводзілася ўнікаць у сутнасць праблем, вывучаць іх знутры, шукаць шляхі, як трапіць у тую ці іншую дзяржпраграму. І тут дапамагалі і раённыя, і абласныя ўлады», — расказвае Марыя Сушчанка.

Газ у пасёлак наогул прыйшоў не дзякуючы, а насуперак усім прагнозам. Праблема не вырашалася гадамі. І, магчыма, зацягнулася б яшчэ на невядомы тэрмін. Але дапамог выпадак. Сельсаветкам накіравалі на імя міністра энергетыкі калектыўны ліст, пад якім свае подпісы паставіла амаль 400 чалавек. І гэта спрацавала.

Пажарны пост — наогул асобная гісторыя. Тут таксама без міністра справа не абышлася. Праўда, на той час Уладзімір Вашчанка быў яшчэ начальнікам Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС. «Менавіта да яго прыходзілася неадназразова звяртацца, каб правільна абгрунтаваць неабходнасць адкрыцця такога аб'екта, — кажа Марыя Сушчанка. — Бо ў той час такія пасты паўсюдна закрываліся. Але Глуша — асобны выпадак. Яна знаходзіцца прыкладна за 30 кіламетраў ад Бабруйска, Асіповіч і Глуска. Пакуль ратавальнікі даязджалі па выкліку, ад палаючага дома заставалася адно вуголле. Мы зрабілі аналіз па пажарах за апошнія некалькі гадоў, палічылі, колькі людзей загінула, — гэтыя лічбы выглядалі пераканаўча. Цяпер пост з поспехам абслугоўвае не толькі Глушанскі сельсавет, але і частку Глускага і Асіповіцкага раёнаў».

## Навесці парадак дапамаглі актывісты

Зараз нават не верыцца, што быў такі змрочны перыяд у жыцці Глушы. Летам яна патанае ў кветніках, прысядзібныя тэрыторыі ўпрыгожваюць малыя архітэктурныя формы. Замест сметнікаў і міні-палігонаў — акультураныя пляцоўкі з ёмістасцямі для раздзельнага збору адходаў. Па выніках 2014 года Глуша стала ўзорам па добраўпарадкаванні для ўсёй краіны. Наогул, пачынаючы з 2009 года назва пасёлка ўсё часцей згадвалася ў якасці прыкладу. Сумесная праца выканаўчай улады, дэпутатаў і органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання па прыцягненні насельніцтва ў працэс наводзін парадку ў роднага пасёлка тут лічыцца ўзорнай.

Імя мясцовага пенсіянера, дэпутата сельскага і Бабруйскага раённага Саветаў Васіля Амялюсіка ведаюць нават у вобласці. Няўрымслівы глушанец шмат сіл аддае грамадскай рабоце, узначальвае добраахвотную дружыну. Марыя Сушчанка з усмешкай успамінае выпадак, калі ёй патэлефанавалі з Камітэта дзяржкантролю і запрасілі да апарата «памочніка дэпутата Васіля Амялюсіка». Жыхарка Вольга Галецкая, старшыня мясцовай ветэранскай арганізацыі, заўсёды ўдзельнічае ў назіральных камісіях, дапамагае пасялковай уладзе «выхоўваць» «прыхільнікаў» асацыяльнага ладу жыцця. Староста вёскі Навасёлкі Уладзімір Хроп умее добра арганізаваць насельніцтва на ўборку тэрыторыі, добраўпарадкаванне могілак, іншыя карысныя справы. Не адстае ад яго яшчэ адзін староста, Васіль Рэкіш, які адсочвае парадак адразу ў некалькіх невялікіх вёсачках. З дапамогай гэтых і іншых актывістаў на тэрыторыі сельсавета традыцыйна праводзяцца акцыі «Лепшы падворак», «Лепшая тэрыторыя Савета», «Наш агульны дом», «Зробім пасёлак прыгажэйшым». Найбольш старанныя ўдзельнікі атрымліваюць лісты з падзякай і сувеніры.



**«Глушанскі хутарок» аб'ядноўвае жыхароў (Марыя СУШЧАНКА злева).**

> Цяпер «Глушанскі хутарок» — брэнд не толькі пасёлка, але і ўсяго раёна.

Моцна аб'ядноўваюць глушанцаў і агульныя святы. Ёсць нават свой фестываль. Сем гадоў таму Марыя Сушчанка выпадкова натрапіла ў інтэрнэце на праграму ААН «Падтрымка навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь». Ідэю падтрымаў раённы аддзел культуры. З трох праектаў, якія сельсавет вылучыў на саіскання гранта Еўрапейскага саюза, фінансавую падтрымку атрымалі два, у тым ліку фестываль народных промыслаў і рамёстваў «Глушанскі хутарок». Ён даў новае жыццё тутэйшаму цэнтру рамёстваў, які таксама ледзь не страцілі.

— Бачылі б вы, як жыхары шчыравалі на добраўпарадкаванні пляцоўкі — будавалі сцэну, глядзельную залу пад адкрытым небам. Фестываль атрымаўся па-сапраўднаму душэўным. На наступны год насельніцтва пажадала яго паўтарыць. Цяпер «Глушанскі хутарок» — брэнд не толькі пасёлка, але і ўсяго раёна.

## Голас, які чуюць

А вось вопытам, які яна набыла за гады свайго кіраўніцтва, Марыя Сушчанка часта дзеліцца на пасяджэннях Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Членам яго яна з'яўляецца вось ужо чацвёрты год. Гэта дае магчымасць вынесці на ўсеагульнае абмеркаванне самыя хвалюючыя тэмы. А розных супярэчнасцяў у рабоце, кажа старшыня пасялковага Савета, узнікае шмат. Напрыклад, адсутнасць вызначанага тэрміну для ўступлення нашчадкаў у правы на спадчыну перашкаджае плённа працаваць па Указу №100. Ёсць і іншыя заўвагі. На яе погляд, значнае павышэнне кошту пустой пластыкавай бутэлькі значна палепшыла б сітуацыю па экалогіі і добраўпарадкаванні. Вырашыць экалагічную праблему дапамагло б і павышэнне адміністрацыйнай адказнасці грамадзян за выкінутае ў забароненым месцы смецце. А для тых, хто прадставіць адпаведны фота-відэадоказ, не дрэнна было б прадугледзець узнагароду. Дарэчы, у тым, што цяпер мы пачалі актыўна займацца раздзельным зборам камунальных адходаў, ёсць заслуга і Марыі Сушчанкі. Калісьці яна настойліва агучвала гэту ідэю на Савеце па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Гэта не значыць, што праграма з'явілася менавіта з яе падачы. Але голас старшыні пасялковага Савета, магчыма, стаў яшчэ адным аргументам для таго, каб яна рэалізавалася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*



**Сёння Глуша ўражвае не сметнікамі, а кветнікамі.**

УЛАСНЫ ПОГЛЯД

# На адрэналін і экстрым попыт ёсць і будзе,

## або Як завабіць турыста ў рэгіёны

**Турысты, што тыя персідскія коцікі, — істоты далікатныя і капрызныя. Ім хоць трэсні, а падай камфорт. Каб нумары без тараканаў, а ручнікі без дзірак. І на рэцэпцыі каб ім усміхаліся, а не пазіралі, нібы партызан на акупанта. І каб на кожным рагу — кавярня або рэстаран. І бясплатны wi-fi пад кожным кустом... Але ёсць такія турысты-авантурысты, якім сэрвіс не тое што не патрэбны, а нават непажаданы...**

Уявіце сабе групку сталічнай моладзі, для каторай адпачынак — не шашлыкоў з півам змалацць і не пуза на сонцы пагрэць. Іх вабяць не ахайненькія гатэльчыкі, не пастаральныя аграсядзібкі і заезджаныя турыстычныя маршрукі, а змярцвелыя заводы, колішнія ваенныя аб'екты і закінутыя панскія маёнткі. Яны паказваюць табе здымкі, зробленыя ў пустых ракетных шахтах пад Смаргонню або ў недабудаваным ліцейным цэху ў Жодзіне. Падземныя калідоры, іржавыя сходы, дзіркі ў падлозе — суцэльны постапакаліпсіс! А яшчэ ёсць старыя дамы ў самых глухіх закутках Беларусі, дзе міжволі верыш у існаванне прывідаў. Сваё захапленне маладзёны жартам называюць «трэш-турызмам». І паходзіць ён з цікаўнасці, што ў маленстве змушала нас гойсаць па тых «карчах», куды дарослыя пад страхам рэмяня хадзіць забаранялі. Затое цяпер гэтыя хлопцы і дзяўчаты аб'ездзілі амаль усю Беларусь. Але дагэтуль знаходзяць новыя і новыя цікавыя напрамкі.

У блуканні па закінутых і зусім не турыстычных на першы погляд аб'ектах ёсць свая эстэтыка. А таксама рызыка паламаць ногі або — што не самае горшае — быць злоўленым міліцыяй. Але адчуванне небяспекі дае ладны зарад адрэналіну, якога не стае сучаснаму офіснаму работніку. Вось і цягаюцца праграмісты, менеджары, маркетолагі ды іншыя «белыя каўнерыкі» па мясцінах, якія абмінаюць добрапрыстойныя грамадзяне. А галівудскія фільмы і камп'ютарныя гульні толькі падагрэваюць гэтую цікавасць. Дый проста хочацца прыгодаў. Таму попыт на трэш-турызм ёсць і будзе.

Яскравы прыклад трэш-турызму — Чарнобыльская АЭС. Для адных станцыя — знак бяды. Для іншых — турыстычны аб'ект, куды легальна і нелегальна імкнуцца дамарослыя сталкеры. І вось тут — увага! — бізнес-ідэя. Ці не ў кожным раёне Беларусі знойдуцца свае індустрыяльныя ці гістарычныя руіны. Напрыклад, завод, што сто гадоў не працуе. Для мясцовых уладаў гэта крыніца хранічнага галаўнога болю. Бо будыніну варта знесці або рэстаўраваць, каб вачэй не мазоліла. Але ж грошай на гэта трэба — мама дарагая! Аднак... і занядбанасць можна манетызаваць. Як? Складаем спіс гэтакіх жудасных і неэстэтычных месцаў у рэгіёне, распрацоўваем турыстычныя маршруты, рыхтуем экскурсаводаў і даём рэкламу. «Іржавае Кальцо Міншчыны!», «Апакаліпсіс на Гомельшчыне!», «Прывіды Віцебшчыны!», «Зомбі-тур па Магілёўшчыне!» і г.д. І чакаем у госці аматараў адрэналіну, экстрэмалаў і проста цікаўных людзей. А самае галоўнае, што інвестыцыі мінімальныя! Адно шыльдачкі павесіць ды пластмасавыя шкілеты раскідаць для антуражу. Ну, і пашукаць з прасцін касцюмы для «прывідаў»...

У выніку мясцовыя бюджэты на роўным месцы могуць «зняць» капейчыну. А трэш-турысты — задаволіць свой прыгодніцкі сверб без рызыкі скруціць галаву або напароцца на ржавую арматурыну. Усе шчаслівыя! А калі гэта ўвесці ў вушы замежнікам, то справа запахне хрумсткімі доларамі і еўра. Бо пляжамі, гатэлямі, замкамі нікога не здзівіш. А пікнік у ракетнай шахце або сэлфі на руінах ліцейнага завода — гэта крута і незвычайна.

Усё сказанае вышэй можна ўспрымаць як жарт. А можна — як перспектыўную ідэю. Прыкладаў, калі грошы робяць літаральна з паветра, у наш час нямала. Варта толькі выйсці за межы звыклых стэрэатыпаў. Хай сабе няма ў нас мора, і з гарамі не надта пашчасціла. Ды можна пашукаць і знайсці тое, чаго няма ў іншых. Якім бы нязвыклым і неэстэтычным яно ні здавалася на першы погляд. Турыста трэба здзіўляць!

**Валянцін БОЙКА.** *boika@zviazda.by*

# БЮДЖЭТ СТВАРАЕМ РАЗАМ

## Якія новаўвядзенні прыйшлі да нас сёлета

**Сёння кожны пяты бюджэт пярвічнага ўзроўню бездатацыйны, тры з пяці — з умераным узроўнем датацый і толькі кожны пяты — датуецца з вышэйшых бюджэтаў на 50 і болей працэнтаў. Гэта неблагі вынік, але яшчэ ёсць над чым працаваць. Пра заканадаўчыя меры, якія накіраваны на аптымізацыю бюджэтаў сельсаветаў, нам расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў — начальнік упраўлення мясцовых бюджэтаў Таццяна АСТРЭЙКА.**

### РАЗМЯРКОЎВАЕМ ВЫДАТКІ

Увогуле ў структуры даходаў мясцовых бюджэтаў пераважаюць уласныя паступленні — яны складаюць у сярэднім каля 70%. А ў Мінску — амаль 100%. Мясцовыя бюджэты маюць адносна стабільныя і раўнамерна размеркаваныя крыніцы даходаў: падаходны падатак (з 2015 года стаўка падвышаная з 12 да 13%), падаткі на ўласнасць (цалкам залічваюцца ў мясцовыя бюджэты), падатак на дабаўленую вартасць (31% падатку, сабранага ў краіне, размяркоўваецца паміж рэгіёнамі згодна з колькасцю насельніцтва). Важна, што самі мясцовыя ўлады могуць уплываць на свае даходы. Так, напрыклад, з падаткам на ўласнасць — органы мясцовага самакіравання маюць права павышаць ці паніжаць стаўкі зямельнага падатку і падатку на нерухомасць да 2,5 раза.

> Добраўпарадкаванне тэрыторый — асноўны аб'ём выдаткаў бюджэтаў пярвічнага ўзроўню і асноўная іх праблема.

Каб у кожнага грамадзяніна быў роўны доступ да паслуг, часам рэспубліканскі бюджэт прадастаўляе фінансавую падтрымку ў выглядзе датацыі і субвенцый. У 2017 годзе такім чынам плануецца перадаць 3,2 млрд рублёў, што складае 19% выдаткаў рэспубліканскага бюджэту. Датацыі — асноўны від фінансавай падтрымкі мясцовых бюджэтаў (яны пераважаюць над субвенцыямі: 70% да 30%). Іх можна выдаткаваць па сваіх меркаваннях, а вось субвенцыі — толькі на канкрэтныя праекты. Напрыклад, на будаўніцтва інфраструктуры, рэабілітацыю тэрыторый, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. З 1 студзеня 2016 года ўсе субвенцыі дзеляцца на аснове празрыстых правілаў. Пастановамі ўрада ўсталяваны парадак іх размеркавання.

> У ідэале трэба, каб на сайце кожнага выканкама або Савета дэпутатаў размяшчалася інфармацыя пра бюджэт гэтага рэгіёна.

Летась пачалі дзейнічаць адзіныя правілы размеркавання падатковых паступленняў паміж бюджэтамі згодна з нормай артыкула 28 Бюджэтнага кодэкса. Так, нарматывы адлічэнняў ад падаткаў у мясцовыя бюджэты захоўваюцца не менш за тры гады. Гэта дадае прадказальнасці. «Сельсаветам гарантавана, што гэты нарматыў будзе ўстойлівым. Для таго каб ён быў больш высокім, трэба працаваць і прад'яўляць эканамічныя разлікі».

Цяпер разглядаецца пытанне аб прадастаўленні мясцовым выканаўчым органам магчымасці прыцягваць арганізацыі, якія размешчаны ў населеных пунктах (незалежна ад формы ўласнасці), да выканання работ па добраўпарадкаванні тэрыторый, прылеглых да іх зямельных участкаў за кошт уласных сродкаў. Мяжа для выканання гэтых работ будзе складаць 50 м у бок вулічна-дарожнай сеткі. «Добраўпарадкаванне тэрыторый — асноўны аб'ём выдаткаў бюджэтаў пярвічнага ўзроўню і асноўная іх праблема. Рэалізацыя гэтай меры дазволіць некалькі знізіць нагрузку на мясцовыя бюджэты, размеркаваўшы яе часткова на прадпрыемствы. Гэта нармальна, калі арганізацыі прымуць удзел у добраўпарадкаванні тэрыторый, на якіх яны працуюць».

### ТРЭНІРУЕМСЯ... НА САБАКАХ

Падатковая аўтаномія мясцовых органаў улады у нас невысокая, але яе стараюцца развіваць крок за крокам. Пакуль не ўсё атрымліваецца. Ёсць у нас мясцовы падатак за валоданне сабакамі. Раней яго памер усталёўваўся ў залежнасці ад вышыні сабакі ў карку. Адзін з раёнаў устанавіў такі ўзровень плацяжоў за валоданне сабакамі, што ён перавысіў кошт камунальных паслуг у месяц. Для таго каб абараніць насельніцтва ад такіх дзеянняў, у Падатковы кодэкс унесены змены: з 1 студзеня 2017 года ён стаў фіксаваны — 0,3 базавай велічыні. Пры гэтым захаваны павышаны нарматыў для сабак небяспечных парод — 1,5 базавай велічыні. Сёлета яшчэ адной навацыяй у гэтым кірунку стала тое, што мясцовым Саветам дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню прадастаўлена права на памяншэнне (раней было і на павелічэнне) — але не больш, чым у 2 разы — ставак такога падатку.

— Мая мара — што прыйдзе той час, калі нашы мясцовыя Саветы дэпутатаў будуць адміністраваць на высокім прафесійным узроўні падатак на нерухомасць, — расказвае Таццяна Астрэйка. — Гэта буйны падатак, і для таго каб ён стаў мясцовым, як у іншых краінах, трэба патрэніравацца на «сабаках». Цяпер мы разам з навукоўцамі прапрацоўваем пытанні паэтапнага пашырэння падатковай аўтаноміі бюджэтаў першаснага ўзроўню. Напрыклад, мэтазгоднасць залічэння ў бюджэты першаснага ўзроўню адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў, збору за ажыццяўленне рамеснай дзейнасці, цалкам курортнага збору і збору з нарыхтоўшчыкаў. Акрамя таго, у мэтах зніжэння адміністрацыйных выдаткаў трэба рацыянальна ўзбуйняць адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Мінскі аблвыканкам, напрыклад, дае магчымасць грамадзянам унесці свае прапановы ў гэтым кірунку. Мінская вобласць — лідар па ўзбуйненні адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.



### КУДЫ СРОДКІ ІДУЦЬ?

Міністэрства фінансаў вядзе актыўную работу па пашырэнні распаўсюджання інфармацыі аб мясцовых бюджэтах. На яго сайце размяшчаюцца звесткі аб бюджэтах усіх узроўняў. Плануецца, што ў хуткім часе з'явяцца карты і іншыя інтэрактыўныя прадукты. У карыстальніка будзе выбар: даверыцца меркаванням экспертаў Мінфіна і скарыстацца гатовай аналітыкай ці адкрыць бюджэт любога ўзроўню на свой густ.

> Адзін з раёнаў устанавіў такі ўзровень плацяжоў за валоданне сабакамі, што ён перавысіў кошт камунальных паслуг у месяц.

— У ідэале трэба, каб на сайце кожнага выканкама або Савета дэпутатаў размяшчалася інфармацыя пра бюджэт гэтага рэгіёна. Калі мы кажам, што грошы выдаткаваны на капітальны рамонт, добра было б, каб мясцовыя органы расказвалі, што пабудаваны паліклініка ці дзіцячы сад, адрамантаваны дамы па такіх адрасах. Каб людзі адчувалі клопат, — тлумачыць Таццяна Астрэйка. — Кожны з нас з'яўляецца падаткаплацельшчыкам, і, па сутнасці, за гэтыя грошы мы купляем бюджэтныя паслугі. Таму важна, каб грамадзяне былі праінфармаваныя аб тым, як расходуюцца гэтыя сродкі, каб яны маглі зрабіць выснову, наколькі рацыянальна ўлада кіруе даходамі, якія ёй даверылі. Добра, калі б гэту ініцыятыву, якая рэалізуецца Мінфінам, падхапілі і ў рэгіёнах.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

ТРЫ ПЫТАННІ ДА ЎЛАДЫ

# Парадак на зямлі, спакой у душы

**Апошнім часам горад Смалявічы і Смалявіцкі раён сталі больш утульнымі, камфортнымі для жыцця. Гэта відаць нават няўзброеным вокам. Змены да лепшага адзначаюць мясцовыя жыхары і госці. Пра тое, як удаецца падтрымліваць парадак, расказаў старшыня Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Павел ГРАФУТКА.**



***— Павел Прохаравіч, ці выпрацавана ў раёне сістэма дбайнага гаспадарання, ашчаднага стаўлення да зямлі?***

— Работа па добраўпарадкаванні і наведзенні парадку на зямлі ў нас носіць сістэмны характар. Кожны год распрацоўваецца адпаведны план, які зацвярджаецца раённым выканаўчым камітэтам і прадугледжвае шматлікія мерапрыемствы і графікі іх выканання. Асноўная ўвага надаецца добраўпарадкаванню і падтрымцы належнага санітарнага стану ў населеных пунктах, лясным фондзе, сельскагаспадарчых і дарожных арганізацыях. На працягу мінулага года ў горадзе рэканструявана вуліца Гандлёвая, уладкаваны тратуары, заменена асфальтавае пакрыццё. Вядзецца рэканструкцыя паваротнага кальца на перасячэнні дарог Р59 і Р69. Адрамантавана вуліца Савецкая з заменай тратуарнай пліткі. А ў цэлым у раёне ўпарадкавана каля 35 кіламетраў дарог з асфальтабетонным пакрыццём, устаноўлены чатыры павільёны на прыпынках грамадскага транспарту.

***— Але парадак на зямлі — гэта не толькі ўладкаванне дарог і вуліц....***

— Бясспрэчна. Гэта шырокі спектр пытанняў. На тэрыторыях сельсаветаў, напрыклад, ліквідавана 397 несанкцыянаваных звалак, расчышчаны і прыбраны грамадзянскія могілкі, воінскія пахаванні, адрамантавана і пафарбавана 12 560 пагонных метраў агароджаў на вуліцах населеных пунктаў, устаноўлена 10 610 п.м новых. Шмат увагі надаём азеляненню, высаджванню дэкаратыўных кустоў і кветак, абрэзцы і выдаленню аварыйных дрэваў, устаноўцы малых архітэктурных формаў. Па ініцыятыве старшынь Азярыцкаслабадскога, Усяжскага, Пліскага, Зеленаборскага сельскіх Саветаў дэпутатаў на падначаленай ім тэрыторыі ўладкоўваецца зоны адпачынку і закладваюцца паркі.

Праведзена значная работа па інвентарызацыі зямель. Адабрана 30 участкаў, да якіх уласнікі ставіліся безгаспадарча. Па стане на 12 снежня мінулага года правялі 75 аўкцыёнаў па продажы ўчасткаў у сельскіх населеных пунктах, новыя ўласнікі набылі 144 надзелы. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 23 лютага 2012 года №100 сельвыканкамы шмат увагі ўдзяляюць змяншэнню колькасці пустуючых і старых пабудоў. На 1 студзеня 2016 года ў вёсках выяўлена 37 такіх дамоў. Шукаем спадчыннікаў, праводзім з імі растлумачальную работу, папярэджваем іх аб прывядзенні ў належны выгляд сваіх радавых гнёздаў. У адваротным выпадку яны будуць знесены. Па стане на 12 снежня знесена 36 старых і прыбрана 218 гаспадарчых пабудоў.

***— Арганізацыі ці ўласнікі падворкаў маюць стымул да таго, каб горад і вёскі станавіліся больш прыгожымі?***

— Вынікі добраўпарадкавання падводзяцца падчас свят вёсак, якіх ужо зладжана 17. Штогод ладзіцца раённы агляд-конкурс па добраўпарадкаванні і наведзенні парадку на зямлі. Пераможцам уручаюцца сертыфікаты і падзякі. У мінулым годзе лепшымі сталі прадстаўнікі Жодзінскага і Азярыцкаслабадскога сельсаветаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# АРЭНДУ ПАДКАРЭКЦІРАВАЛІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Дапускаецца здача ў арэнду такой маёмасці па прызначэнні, якое адрозніваецца ад прызначэння аб'екта альбо мэтавага прызначэння зямельнага ўчастка. Пры гэтым Аляксандр Смірноў нагадаў, што арандатар абавязаны выконваць патрабаванні заканадаўства, якое рэгулюе парадак і ўмовы ажыццяўлення адпаведнай дзейнасці.

Спецыяліст упэўнены, што гэта новаўвядзенне дасць магчымасць больш актыўна уключаць любую нерухомасць у гаспадарчы абарот. Напрыклад, ва ўласніка ёсць будынак, які зарэгістраваны як гараж, і ён размешчаны на зямельным участку, што прызначаны для абслугоўвання гаража. Калі такі будынак у сілу розных прычын не выкарыстоўваецца па мэтавым прызначэнні, уласнік можа здаць яго ў арэнду пад станцыю тэхабслугоўвання (СТА), склад або пад нешта іншае. Яшчэ летась падобнае нямэтавае выкарыстанне зямельнага ўчастка магло скончыцца для ўласніка нерухомасці сур'ёзнымі непрыемнасцямі. Сёння такое нямэтавае выкарыстанне без дадатковай папяровай цяганіны і выдаткаў атрымала законныя падставы.

## Прэферэнцыі вёскам і малым гарадам

Сёлета стала прасцей займацца бізнесам у сельскай мясцовасці. Цяпер ёсць магчымасць прадастаўляць — у бязвыплатнае карыстанне — нерухомую маёмасць юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам для арганізацыі ці (або) аказання бытавых паслуг у сельскіх населеных пунктах. Пры гэтым вызваленыя ад арэнднай платы юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі будуць кампенсаваць камунальныя паслугі і амартызацыю, падатак на нерухомасць і зямельны падатак па прадстаўленых ім аб'ектах нерухомасці.

Не забыліся распрацоўшчыкі новаўвядзенняў і пра арандатараў у малых гарадах. Указам удакладнена, што паніжальны каэфіцыент 0,4 на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў, гарадоў раённага падпарадкавання будзе ўжывацца пры арэндзе нерухомай маёмасці незалежна ад віду дзейнасці арандатара. Цяпер каэфіцыент ужываецца пры ажыццяўленні дзейнасці па вытворчасці прадукцыі, выкананні работ і аказанні паслуг. Аднак існуе пэўнае абмежаванне. Так, паніжальны каэфіцыент не будзе прымяняцца ў Заслаўі і гарадах раённага падпарадкавання з колькасцю насельніцтва больш за 50 тысяч чалавек (Барысаве, Мазыры, Лідзе, Оршы, Полацку і іншых).

## Без арэнды, па спісе

Указ стаў прыемнай навіной і для прадпрымальнікаў, якія забяспечваюць харчаванне курсантаў. Ім, як і юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, якія арганізуюць харчаванне выхаванцаў, навучэнцаў і студэнтаў, нерухомая маёмасць будзе прадастаўляцца ў бязвыплатнае карыстанне.

Дарэчы, з 1 студзеня на ўмовах бязвыплатнага карыстання будзе размяшчацца таксама фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і яго тэрытарыяльныя органы, да якіх як да арандатараў дзяржмаёмасці летась прымяняўся паніжальны каэфіцыент 0,5. Таксама ў пералік арганізацый, якім дзяржаўная нерухомая маёмасць можа быць прадастаўлена ў бязвыплатнае карыстанне, уключаны Эканамічны Суд СНД і Суд Еўразійскага эканамічнага саюза. Прадугледжана таксама прадастаўленне дзяржаўнай нерухомай маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне замежным або міжнародным юрыдычным асобам альбо арганізацыям, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, у выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі нашай краіны. У спіс ільготнікаў трапілі і суб'екты гаспадарання ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

## У сталічным рэгіёне заплацяць больш

Паводле прапановы Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, сёлета ў Мінскім раёне па адміністрацыйных будынках у два разы (з 0,1 да 0,2) павышаецца базавая стаўка арэнды. На рынках і гандлёвых цэнтрах базавая стаўка павялічваецца з 0,3 да 0,4 базавай арэнднай велічыні.




Паводле інфармацыі Аляксандра Смірнова, гэта павышэнне цалкам абгрунтаванае і адпавядае рэальнай сітуацыі на рынку. Да апошняга часу ўзровень арэнднай платы за дзяржаўную нерухомасць у Мінскім раёне быў істотна ніжэйшы ў параўнанні з прыватнікамі.

Зрэшты, Дзяржаўны камітэт па маёмасці прапануе арэндадаўцам выкарыстоўваць «кампенсавальны механізм», які дазваляе гнутка падыходзіць да ўстанаўлення арэнднай платы. Пры яе разліку акрамя базавай стаўкі прымяняецца таксама каэфіцыент эфектыўнасці ад 0,5 да 3. Для захавання арэндных адносін у арэндадаўцы ёсць магчымасць выкарыстоўваць менавіта нізкі каэфіцыент. (Цяпер, напрыклад, ён у асноўным устаноўлены ў памеры 3.)

Дарэчы, пасля ўступлення ў сілу Указа спросціцца і парадак пералічэння ў бюджэт сродкаў, атрыманых ад здачы ў арэнду дзяржаўнай нерухомай маёмасці. Цяпер з атрыманай арэнднай платы будзе адымацца налічаны ПДВ, 25% ад сумы, якая засталася, пералічыцца ў бюджэт, і ўжо з рэшты арэндадаўца будзе плаціць падаткі, зборы і іншыя абавязковыя плацяжы, кампенсаваць налічаную амартызацыю, а таксама пакідаць частку сродкаў у сваім распараджэнні. Пры гэтым, як тлумачаць у Дзяржкаммаёмасці, узровень паступлення сродкаў у бюджэт не павінен істотна змяніцца.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

НЕРУХОМАСЦЬ

# КВАТЭРА І КАТЭДЖ ЗА... БАЗАВУЮ ВЕЛІЧЫНЮ

**У Віцебскай вобласці ў 2016 годзе закрылі каля 100 школ і дзіцячых садкоў. У 2017-м плануецца закрыццё яшчэ 35 школ. Што рабіць з будынкамі? Можа, як кажуць спецыялісты ад будаўніцтва, «закансерваваць» да лепшых часоў? Ці лепш зусім знесці? На Віцебшчыне знайшлі іншы, найбольш эфектыўны ў эканамічным сэнсе падыход — прадаваць будынкі на аўкцыёнах. У прыватнасці, за год «з малатка» пайшло 15 аб'ектаў. Якая ў гэтым карысць?**

## Купіце школу!

Асаблівасць Прыдзвінскага краю ў тым, што тут вялікая колькасць населеных пунктаў — каля 6,5 тысячы. З іх больш за 2 тысячы можна назваць неперспектыўнымі, «выміраючымі». Там колькасць насельніцтва не перавышае некалькі дзясяткаў чалавек. Нямала вёсак, дзе жывуць меней за 10 чалавек, а то і па адным.

Ва ўпраўленні адукацыі аблвыканкама падкрэсліваюць, што вучэбныя ўстановы зачыняюць толькі там, дзе мала дзятвы. Насамрэч, калі ў вёсцы хлопчыкаў і дзяўчынак па пальцах можна пералічыць, навошта траціць штогод вялікія сумы з бюджэту на эксплуатацыю школьных будынкаў? Плюс на зарплаты выхавацелям і педагогам? Прасцей да бліжэйшых школ арганізаваць падвоз на школьных аўтобусах.

У Віцебскім абласным тэрытарыяльным фондзе дзяржаўнай маёмасці (далей — «Віцебскаблмаёмасць». — **Аўт.**) канстатуюць, што будынкі школ можна выкарыстоўваць пад жыллё, для гаспадарчых патрэб і гэтак далей.

— Старшыня аблвыканкама Мікалай Шарстнёў даручыў актывізаваць уключэнне ў гаспадарчы абарот закрытых школ і садкоў, больш актыўна шукаць і знаходзіць новых уласнікаў для будынкаў і збудаванняў, якія не выкарыстоўваюцца. Калі на працягу 6—7 месяцаў аб'ект не купілі, нават з паніжэннем пачатковай цаны (спачатку на 50, потым на 80%), яго можна прадаць за базавую велічыню. На момант нашай гутаркі па гэтай цане можна купіць каля 10 былых устаноў адукацыі, — расказаў нашаму карэспандэнту **кіраўнік фонду «Віцебскаблмаёмасць» Міхаіл ПАЎЛЮЧКОЎ.**

Увогуле на аўкцыённыя таргі выстаўлена 14 школ і дзіцячых садкоў. Аналагічныя аб'екты рэалізуюць і ў іншых абласцях. Напрыклад, у Петрыкаўскім раёне сям'я пасялілася ў былой школе. Там жа ўтрымліваюць скаціну, курэй...

22 снежня прадалі школу ў вёсцы Камары Віцебскага раёна. Пачатковая аўкцыённая цана — каля 42 тысяч рублёў. Прадалі з яе перавышэннем на 5% (за 45 тысяч).

— Будынак здалі «пад ключ» у 1969 годзе. Агульная плошча аб'екта больш за 1,7 тысячы «квадратаў». Знаходзіцца на міжнароднай трасе М-3 «Мінск—Віцебск» — за 5 кіламетраў ад Віцебска... Новы ўласнік плануе выкарыстоўваць набытую маёмасць у сваёй гаспадарчай дзейнасці — у 2017 годзе там будзе арганізаваны выраб пелет. Створаць 20 рабочых месцаў, — працягвае Міхаіл Паўлючкоў.


**Школа ў вёсцы Камары на вуліцы Школьнай (Віцебскі раён).**

## Змена профілю

Сёння можна купіць школы і садкі ў Браслаўскім, Верхнядзвінскім, Бешанковіцкім, Віцебскім і іншых раёнах Віцебшчыны. Сярод іх драўляныя і мураваныя будынкі, адна- і двухпавярховыя, ёсць і ў тры паверхі. Найстарэйшая школа пабудавана ў 1950-я гады. А сярод параўнальна нядаўна ўзведзеных — комплекс школьных пабудоў (1995 года) у вёсцы Дрыгучы Мёрскага раёна. Агульная плошча перавышае 1,3 тысячы квадратных метраў.

А ў вёсцы Клюкаўка Аршанскага раёна можна набыць трохпавярховую базавую школу-садок агульнай плошчай каля 4 тысяч квадратных метраў. Зразумела, ёсць усе камунальныя выгоды.

Для параўнання, у вёсцы Пронскае, што за 5 кіламетраў ад Лёзна, прадаюць школьны будынак плошчай усяго каля 105 «квадратаў». Водазабеспячэння і каналізацыі няма.

У будынках, якія набылі новых гаспадароў, адкрыты вытворчыя майстэрні, цэхі. Адзін стаў лазняй...

## Казарму возьмеце?

У самым цэнтры Віцебска на пешаходнай вуліцы Крылова прадаецца будынак, які ўзвялі да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Раней ён выкарыстоўваўся для грамадскіх патрэб. Цана пытання — 131 тысяча рублёў «новымі».

На вуліцы Будзённага таксама прадаецца гістарычная славутасць — будынкі былых казармаў артылерыйскай брыгады. Сярод іншага там ёсць і салдацкая чайная. У ідэале чаму б патэнцыйнаму пакупніку не стварыць там, напрыклад, спецыялізаваную кавярню? А казармы можна было б пераўтварыць у стыльны гатэль. Безумоўна, знаходжанне ў такім месцы запомнілася б надоўга. Турысты любяць нешта неардынарнае.

У абласным цэнтры прадаюцца і былая бібліятэка на ўскраіне, склад, вытворчая база...

***P.S.*** *За непрыняцце мер па забеспячэнні эфектыўнага выкарыстання маёмасці да дысцыплінарнай адказнасці ў 2015 годзе прыцягнута 17 чалавек. Сярод іх супрацоўнікі выканкамаў і кіруючыя работнікі арганізацый (балансатрымальнікі). У 2016-м пакаралі 1 юрыдычную асобу і 8 службовых. Агульны памер штрафаў — 798 рублёў.*

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# ЯНЫ ДЛЯ ВЁСКІ — ЯК СЭРЦА

**Калі праз вёску праязджае старшыня сельскага Савета, яму мала што скажуць пратаптаная ў снезе сцежка ці дым з коміна. Зразумець, чым жыве вёска, можа толькі той, хто не адзін год жыў побач з яе насельнікамі. Таму і не знікае пасада вясковага старасты — чалавека аднолькава блізкага як да людзей, так і да ўлады. Праца Марыі Міхайлаўны Маліноўскай і Кацярыны Фёдараўны Валодчанкі якраз і з'яўляецца прыкладам гэтага.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Каб усё было

Староста на вёсцы не толькі пасада, а і «твар» усяго пасёлка. Трэба, каб і падворак у яго быў у парадку, і паводзіны прыстойныя, і да людзей каб быў неабыякавы. Калі ў Шырокаўскім сельсавеце Буда-Кашалёўскага раёна пачалося спаборніцтва сярод домаўладанняў, Марыя Маліноўская таксама ўключылася ў яго: пафарбавала фасад хаты, насадзіла кветак. Прыклад старасты аказаўся такім натхняльным, што іншыя вяскоўцы вырашылі не адставаць і навесці прыгажосць на падворках.

У пасёлку Краснагорск Марыя Міхайлаўна — самы актыўны завадатар. Жанчына кажа, што браць на сябе адказнасць і самой вырашаць праблемы навучыла жыццё.

— На вёсцы я самая маладая, нарадзілася ў сорак чацвёртым. Жылі разам з маці — тры браты і я. Бацька не вярнуўся з фронту. Замест хаты памятаю невялікі склепок у зямлі, дзе мы начавалі.

Сям'я жыла небагата, дзеці пачалі працаваць яшчэ са школы. Марыя, ледзь паклаўшы партфель, бегла да маці дапамагаць выкопваць бульбу для калгаса. Яшчэ малалеткай уладкавалася на будоўлю ў пасёлак Камунары, што знаходзіўся за адзінаццаць кіламетраў ад дома. Была падсобніцай, уручную замешвала раствор і падымала цэглу... Па стане здароўя вымушана была перайсці нянькай у дзіцячы садок. На новую работніцу адначасова зваліліся абавязкі і качагара, і прачкі. Такім чынам адпрацавала яшчэ 11 гадоў, а ўжо перад самай пенсіяй уладкавалася на жывёлагадоўчы комплекс.

— Раней тут шмат народу жыло, па святах моладзь хадзіла з гармонікам, — успамінае гаспадыня мінулыя часы. — Калі згарэла вёска Міхалёўка, яе жыхароў пачалі рассяляць па акрузе. Наша сям'я адбудавалася ў Краснагорску. Мясцовыя называлі яго Абісініяй, бо самыя працавітыя тут сяліліся. Цяпер жа апусцеў пасёлак, усяго пяць чалавек засталося. Налета, праўда, дачнікі прыязджаюць, з імі весялей. Для нас тут асноўны занятак — агарод, але і акрамя яго праца ёсць. Збіраю грошы, што з самаабкладання ідуць, выходжу на суботнікі разам са старшынёй сельскага Савета, а магу і сама касу ў рукі ўзяць ды быльнік вакол дамоў збіць. Недалёка ёсць магілкі загінулых салдат, іх таксама даглядаю.

Па словах старшыні Шырокаўскага сельскага Савета Юліі Шаўцовай, афіцыйна гэты помнік ахвярам вайны на ўліку ў раёне не значыўся. Пра тое, каб над магіламі ўсталявалі крыж і ўладкавалі тэрыторыю, паклапацілася краснагорская староста, якая даведалася пра пахаванне ад мясцовых жыхароў.

Асаблівай заслугай Марыі Міхайлаўны з'яўляецца аўтобусны прыпынак. Раней на месцы, дзе чакалі транспарт, не было дзе схавацца ад непагадзі. Упаўнаважаная змагла дамовіцца з людзьмі, і тыя змайстравалі лаўкі. На гэтым ініцыятыўная прадстаўніца грамадскага самакіравання не спынілася і звярнулася з просьбай да кіраўніцтва. Старшыню так уразіла прапанова: «Мы і самі можам скласці будачку з бярвенняў, накрыць шыферам, але ж гэта будзе не так прыгожа», — што хутка ў пасёлку Краснагорск з'явіўся сапраўдны прыпынак з бетоннымі сценамі.

На пасаду старасты Марыю Міхайлаўну вяскоўцы абіраюць трэці раз. Сапраўды, цяжка ўявіць на гэтым месцы каго іншага, бо дзесяць гадоў — гэта і вялікі досвед, і вялікі давер. Калі раптам знікае электрычнасць, камусьці спатрэбяцца дровы ці торф — жыхары Краснагорска ведаюць, што трэба ісці да Маліноўскай. Сама ж гаспадыня сваю дзейнасць характарызуе проста: «Такі мой клопат, каб усё было».

## «Да гэтага часу сніцца...»

Асаблівая гісторыя звязвае Кацярыну Фёдараўну Валодчанку і сям'ю, адкуль забралі дзіця з прычыны дрэннага выхавання бацькамі сваіх абавязкаў. Жанчына ўзяла да сябе на ўтрыманне трохмесячную дзяўчынку. Прыкладна праз год маці малой аднавіла правы на яе.

— Дзяўчынка да гэтага часу мне сніцца, але як можна было не аддаць маці яе дзіця.

На Буда-Кашалёўшчыну жанчына прыехала з Расіі, жыве тут 17 гадоў, працавала даяркай.

Першае, што зрабіла Кацярына Фёдараўна ў новай грамадскай ролі, — гэта правяла інвентарызацыю. Падлічыла, колькі на «падапечным» участку домаўладанняў, калодзежаў, калонак. Агледзела школу і могілкі. Пазначыла, якія людзі жывуць і каму з іх патрэбна больш увагі.

Звычайна да старасты звяртаюцца са звыклымі праблемамі: прыбраць паваленае дрэва, расчысціць снег... Жыхароў не так многа, і таму навіны разыходзяцца хутка. Калі бачна, што чалавек трапіў у складаную сітуацыю, упаўнаважаная сама падыходзіць і прапануе дапамогу. Наогул, у вёсцы Кацярына Фёдараўна ўніверсальны дарадчык. Пытанні ёй задаюць самыя розныя: пра падаткі, прыватызацыю, працаўладкаванне, льготы... Каб быць кампетэнтнай, жанчына кожную сераду наведвае нарады ў сельскім Савеце, а потым даносіць новую інфармацыю да сваіх аднавяскоўцаў.

Кацярыну Валодчанку неаднаразова ўзнагароджвалі за актыўную грамадскую дзейнасць, у тым ліку за перамогу на абласным конкурсе. Жанчына таксама з'яўляецца дэпутатам сельскага Савета.

— Не ўсе праблемы можна вырашыць адным тэлефонным званком. Некаторыя з іх патрабуюць фінансавых сродкаў, часу, рабочых рук... Няхай сітуацыя палепшыцца праз некалькі гадоў, але вяскоўцы хоць бы будуць бачыць, што пра іх не забыліся.

Калі летам староста займаецца добраўпарадкаваннем, то з прыходам халадоў у яе з'яўляюцца іншыя абавязкі. У вёсцы некалькі дамоў на зіму застаюцца без догляду, іх стан становіцца клопатам старасты. Жанчына абходзіць падворкі, сочыць, каб не было ўзлому. Правярае яна і некаторых гаспадароў: ці выходзіў чалавек сёння на вуліцу, ці не стала яму раптам дрэнна? І да кожнага шукае свой падыход.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

*Мінск — Буда-Кашалёўскі раён — Мінск.*

**Алена АЛЕКСІНА, старшыня Буда-Кашалёўскага раённага Савета дэпутатаў:**

— У Гомельскай вобласці распрацаваны прыкладныя палажэнні аб органах тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — як калегіяльнага, так і індывідуальнага. На падставе гэтых дакументаў, якія датычацца індывідуальнага самакіравання, кожны сельскі Савет распрацоўвае сваё палажэнне, зацвярджае яго на сесіі, а потым на сельскім сходзе адбываецца выбранне старасты. У раёне ёсць старасты, упаўнаважаныя, старэйшыны і памочнікі старшыні сельсавета. Насамрэч гэта адзін і той жа прадстаўнік тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, проста кожны сход вызначае, якой назвай будзе карыстацца ў далейшым. Калі паглядзець структуру органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў Буда-Кашалёўскім раёне, то з 171 чалавека 142 працуюць на сельскіх тэрыторыях. Некаторыя старасты апякуюцца некалькімі вёскамі, асабліва калі людзей у іх жыве няшмат. Часцей за ўсё старастамі становяцца людзі, якія маюць спецыяльнасць сацыяльнага работніка, страхавога агента, паштальёна... Яны па родзе заняткаў пастаянна знаходзяцца ў руху, злучаюць мясцовых жыхароў з раённым кіраўніцтвам.

Пасля выбараў прадстаўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання запрашаюць у раён на вучобу. На гэтых сустрэчах улічваецца спецыфіка працы ў горадзе і вёсцы. Памочнікам старшынь уручаем пасведчанні, расказваем пра кірункі дзейнасці, перадаём дзённікі, дзе маюцца тэлефоны надзвычайных службаў, аддзелаў кіравання выканкама, раённых службаў.

Работа старасты — гэта вырашэнне пытанняў самага рознага кшталту. Ён дапамагае раённым структурам у маніторынгу насельніцтва на падапечнай тэрыторыі, кантралюе выкананне паслуг, рэагуе на скаргі грамадзян, сочыць за сітуацыяй у неўладкаваных сем'ях, трымае на кантролі пажылых і адзінокіх...

Кожны год мы заахвочваем найбольш актыўных памочнікаў старшынь. Уручаем лісты падзякі, ганаровыя граматы. Штоквартальна ў раённы бюджэт закладваецца пэўная сума на падтрымку прадстаўнікоў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Памер падтрымкі аднаго старасты складае ад паловы да адной базавай велічыні і залежыць ад колькасці людзей, што жывуць на тэрыторыі, дзе абраны староста. Яшчэ на ўзроўні і раёна, і вобласці вызначаны палажэнні аб правядзенні конкурсаў на выяўленне самай плённай працы сярод органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, пераможцы якіх таксама атрымліваюць пэўныя ўзнагароды. У раёне мы штогод падводзім вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця, кожная галіна прадстаўляе сваіх самых лепшых работнікаў. Ад сельскіх Саветаў мы ва ўрачыстых абставінах ушаноўваем двух самых актыўных старастаў.

Дзяржава для народа
**Мясцовае Самакіраванне**
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2017 года.**

## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Схапі грошы на паліва»

A-100

**Настоящие Правила разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Схапі грошы на паліва» (далее – Игра), проводимой в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ), сопутствующих товаров и услуг среди участников программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющих брелоком (накопительные информационно-учетные карты с индивидуальным номером, в дальнейшем – Брелок), в г. Минске, Минской области, Брестской области.**

**1. Организатор Игры**

Организатором Игры является Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг» (ОДО «Астотрейдинг»), находящееся по адресу: 223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, дом 7, административные помещения; УНП 690362737;

E-mail: a-100@a-100.by

**2. Наименование Игры**

Игра носит название «Схапі грошы на паліва».

**3. Участники Игры**

В Игре могут принять участие дееспособные физические лица, проживающие на территории Республики Беларусь в период проведения Игры, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь и имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, владеющие Брелоком.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Права участников Игры**

Участник Игры имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами, и получать соответствующие Призы.

Каждый Участник может принимать участие в Игре неограниченное количество раз.

**5. Сроки проведения Игры**

Начало Игры: 03 февраля 2017 года

Окончание Игры: 06 апреля 2017 года.

**6. Территория проведения Игры:**

Республика Беларусь, а именно, территория, на которой расположены автозаправочные станции ОДО «Астотрейдинг» (далее – АЗС ОДО «Астотрейдинг»): г. Минск, Минская область, Брестская область.

**7. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования которых проводится Игра**

Игра проводится в целях стимулирования реализации топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ), реализации сопутствующих товаров и услуг среди участников программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющих Брелоком.

| Наименование | Количество, призов | Общая стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| Денежные средства на приобретение топлива в размере 1070 рублей 10 копеек в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» и 159 рублей 90 копеек для выплаты подоходного налога | 3 | 3690 |
| Денежные средства на приобретение топлива в размере 107 рублей 1 копейка в сети АЗС ОДО «Астотрейдинг» и 15 рублей 99 копеек для выплаты подоходного налога | 50 | 6150 |

**8. Призовой фонд**

Призовой фонд игры в размере **9 840** (девять тысяч восемьсот сорок) белорусских рублей формируется за счет денежных средств Организатора.

**9. Порядок участия в Игре**

9.1. Для участия в Игре участники программы благодарности «Дзякуй» ОДО «Астотрейдинг», владеющие Брелоком в период с 00:00:01 03 февраля 2017 года по 23:59:59 01 апреля 2017 года, должны выполнить следующие условия:

**1-й этап:** с 00:00:01 3 февраля 2017 года по 23:59:59 16 февраля 2017 года заправиться любым видом топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) на сумму 15 (пятнадцать) белорусских рублей и более на любой АЗС согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №1 | г. Минск, ул. Пригородная, 69 |
| АЗС №2 | Минский р-н, д. Боровая, 7 |
| АЗС №5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 2а, корп. 3 |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр-т Партизанский, 8а |
| АЗС №11 | г. Минск, ул. Машиностроителей, 7Б |
| АЗС №12 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62В |
| АЗС №13 | г. Минск, ул. Радиальная, 13А |
| АЗС №15 | г. Минск, ул. Промышленная, 2Б (МКАД) |
| АЗС №16 | г. Минск, ул. Казинца, 133 (МКАД) |
| АЗС №17 | г. Минск, ул. Некрасова, 41 |
| АЗС №18 | Минский район, Новодворский с/с, М4, 15км, 2 (д. Ельница) |
| АЗС №19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40, |
| АЗС №22 | Минская обл., Смолевический р-н, автодорога Минск-Брест – граница РФ, 388 км (справа) |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС №25 | Минский р-н, аг. Сеница, ул. Зеленая, 1/4 |
| АЗС №26 | г. Брест, ул. 28 июля |
| АЗС №27 | г. Брест, ул. Радужная, 20 |
| АЗС №28 | г. Брест, пр. Республики, 6 |
| АЗС №29 | г. Брест, ул. Я. Купалы, 106/4 |
| АЗС №30 | г. Минск, ул. Аннаева, 47 |
| АЗС №31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС №32 | Брестская область, Малоритский р-н, агр. Мокраны, ул. Брестская |
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

**2-й этап**: с 00:00:01 17 февраля 2017 года по 23:59:59 23 февраля 2017 года приобрести сопутствующих товаров на сумму 5 (пять) белорусских рублей и более на любой АЗС согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №1 | г. Минск, ул.Пригородная,69 |
| АЗС №2 | Минский р-н, Боровая, 7 |
| АЗС №5 | г. Минск, ул. Промышленная, 2Б (МКАД) |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр. Партизанский, 8а |
| АЗС №18 | Минский р-н, трасса на г. Могилев (М4), 4 км от МКАД |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС №25 | а/г Сеница, ул. Зеленая, 1/4 |
| АЗС №27 | г. Брест, ул. Радужная, 20 |
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

**3-й этап:** с 00:00:01 24 февраля 2017 года по 23:59:59 02 марта 2017 года приобрести сопутствующие услуги на сумму 7 (семь) белорусских рублей и более на любой АЗС согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №2 | Минский р-н, Боровая, 7 |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр. Партизанский, 8а |
| АЗС №18 | Минский р-н, трасса на г. Могилев (М4), 4 км от МКАД |
| АЗС №19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №24 | АД Р1 «Брест-Минск», 9-ый км |
| АЗС №25 | а/г Сеница, ул. Зеленая, 1/4 |
| АЗС №26 | г. Брест, ул. 28 июля |
| АЗС №31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

**4-й этап:** с 00:00:01 03 марта 2017 года по 23:59:59 09 марта 2017 года приобрести 2 кофе на выбор (американо, капучино, латте, эспрессо, двойной американо, двойной капучино, двойной латте) и 2 хот-дога на выбор (датский, французский) на любой АЗС согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №1 | г. Минск, ул. Пригородная, 69 |
| АЗС №2 | Минский р-н, д. Боровая, 7 |
| АЗС №5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 2а, корп. 3 |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр-т Партизанский, 8а |
| АЗС №12 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62В |
| АЗС №13 | г. Минск, ул. Радиальная, 13 А |
| АЗС №15 | г. Минск, ул. Промышленная, 2Б (МКАД) |
| АЗС №16 | г. Минск, ул. Казинца, 133 (МКАД) |
| АЗС №18 | Минский район, Новодворский с/с, М4, 15 км, 2 (д. Ельница) |
| АЗС №19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40 |
| АЗС №22 | Минская обл., Смолевический р-н, автодорога Минск-Брест – граница РФ, 388 км (справа) |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС №25 | Минский р-н, аг. Сеница, ул. Зеленая, 1/4 |
| АЗС №26 | г. Брест, ул. 28 июля |
| АЗС №27 | г. Брест, ул. Радужная, 20 |
| АЗС №28 | г.Брест, пр.Республики, 6 |
| АЗС №29 | г. Брест, ул. Я. Купалы, 106/4 |
| АЗС №31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС №32 | Брестская область, Малоритский р-н, агр. Мокраны, ул. Брестская |

**5-й этап:** с 00:00:01 10 марта 2017 года по 23:59:59 16 марта 2017 года приобрести сопутствующие товары на сумму 3 (три) белорусских рубля и более на любых двух АЗС согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №18 | Минский р-н, трасса на г. Могилев (М4), 4 км от МКАД |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40 |
| АЗС №24 | АД Р1 «Брест-Минск», 9-ый км |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №28 | г. Брест, пр. Республики, 6 |
| АЗС №26 | г. Брест, ул. 28 июля |
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

**6-й этап:** с 00:00:01 17 марта 2017 года по 23:59:59 23 марта 2017 года необходимо заправиться на 35 литров топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) на АЗС №35 или 29 литров топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) на АЗС №29 согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |
| АЗС №29 | г. Брест, ул. Я. Купалы, 106/4 |

**7-й этап:** с 00:00:01 24 марта 2017 года по 23:59:59 30 марта 2017 года необходимо: заправить 30 литров топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ), приобрести сопутствующие товары на сумму 5 (пять) белорусских рублей и более и сопутствующие услуги (мойка туннельная, мойка портальная, пылесос, аренда прицепов) на сумму 5 (пять) белорусских рублей и более на любой АЗС согласно приведенной таблице:

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №1 | г. Минск, ул. Пригородная, 69 |
| АЗС №2 | Минский р-н, д. Боровая, 7 |
| АЗС №5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 2а, корп.3 |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр-т Партизанский, 8а |
| АЗС №11 | г. Минск, ул.Машиностроителей,7Б |
| АЗС №12 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62В |
| АЗС №13 | г. Минск, ул. Радиальная, 13 А |
| АЗС №15 | г. Минск, ул. Промышленная,2 Б (МКАД) |
| АЗС №16 | г. Минск, ул. Казинца, 133 (МКАД) |
| АЗС №17 | г. Минск, ул. Некрасова, 41 |
| АЗС №18 | Минский район, Новодворский с/с, М4, 15 км, 2 (д. Ельница) |
| АЗС №19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40 |
| АЗС №22 | Минская обл., Смолевический р-н, автодорога Минск-Брест – граница РФ, 388 км (справа) |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС №25 | Минский р-н, аг.Сеница, ул. Зеленая,1/4 |
| АЗС №26 | г. Брест, ул. 28 июля |
| АЗС №27 | г. Брест, ул. Радужная, 20 |
| АЗС №28 | г. Брест, пр. Республики, 6 |
| АЗС №29 | г. Брест, ул. Я.Купалы, 106/4 |
| АЗС №30 | г. Минск, ул. Аннаева, 47 |
| АЗС №31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС №32 | Брестская область, Малоритский р-н, агр. Мокраны, ул. Брестская |
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

**8-й этап:** с 00:00:00 01 апреля 2017 года по 23:59:59 01 апреля 2017 года необходимо:

1. Приобрести 1 батончик «Сникерс» на одной АЗС согласно приведенной таблице.

2. Приобрести 5 литров любого вида топлива (АИ-92, АИ-95, ДТ) на другой АЗС согласно приведенной таблице.

3. Прислать фото чеков о выполнении этапов 8 (п. 1. и п. 2.) на адрес ermak@a-100.by.

| Номер АЗС | Адрес |
|---|---|
| АЗС №1 | г. Минск, ул. Пригородная, 69 |
| АЗС №2 | Минский р-н, д. Боровая, 7 |
| АЗС №5 | г. Минск, ул. Масюковщина, 2а, корп. 3 |
| АЗС №6 | г. Минск, ул. Харьковская, 81 |
| АЗС №7 | г. Минск, пр-т Партизанский, 8а |
| АЗС №11 | г. Минск, ул. Машиностроителей, 7Б |
| АЗС №12 | г. Минск, ул. Притыцкого, 62В |
| АЗС №13 | г. Минск, ул. Радиальная, 13А |
| АЗС №15 | г. Минск, ул. Промышленная, 2Б (МКАД) |
| АЗС №16 | г. Минск, ул. Казинца, 133 (МКАД) |
| АЗС №17 | г. Минск, ул. Некрасова, 41 |
| АЗС №18 | Минский район, Новодворский с/с, М4, 15 км, 2 (д. Ельница) |
| АЗС №19 | г. Минск, ул. Брикета, 23 (МКАД) |
| АЗС №20 | г. Минск, Долгиновский тракт, 190 (МКАД) |
| АЗС №21 | г. Минск, ул. Ваупшасова, 40, |
| АЗС №22 | Минская обл., Смолевический р-н, автодорога Минск-Брест – граница РФ, 388 км (справа) |
| АЗС №23 | г. Минск, Казимировская, 39 |
| АЗС №24 | Минский р-н, Щомыслицкий с/с, Р 1 |
| АЗС №25 | Минский р-н, аг. Сеница, ул. Зеленая,1/4 |
| АЗС №26 | г. Брест, ул. 28 июля |
| АЗС №27 | г. Брест, ул. Радужная, 20 |
| АЗС №28 | г. Брест, пр. Республики, 6 |
| АЗС №29 | г. Брест, ул. Я. Купалы, 106/4 |
| АЗС №30 | г. Минск, ул. Аннаева, 47 |
| АЗС №31 | г. Минск, ул. Академическая, 34 |
| АЗС №32 | Брестская область, Малоритский р-н, агр. Мокраны, ул. Брестская |
| АЗС №35 | Минский р-н, Новодворский с/с, 82 |

9.2. В Игре принимают участие только владельцы зарегистрированных Брелоков. Зарегистрировать Брелок необходимо через личный кабинет, ссылка на который расположена на главной странице официального сайта Организатора по адресу http://azs.a-100.by/. Для регистрации необходимо:

- заполнить все обязательные поля в анкете (помеченные символом * (звездочка), а именно: фамилия, имя, отчество, пол, дата рождения, адрес электронной почты, номер мобильного телефона, адрес проживания, вид топлива, тип транспортного средства, марка транспортного средства, год выпуска транспортного средства, год получения водительского удостоверения;

- получить на указанный пользователем в анкете номер телефона код активации, ввести его в личном кабинете;

-завершить регистрацию, нажав на соответствующую кнопку.

9.3. Участник, изъявивший желание участвовать в Рекламной игре с 2,3,4,5,6,7,8 этапа, может выполнить условия предыдущих и действующего этапа в сроки, установленные действующим этапом.

9.4. В Игре принимают участие участники, выполнившие требования настоящих Правил.

**10. График проведения розыгрышей призового фонда**

Розыгрыш призового фонда Игры проходит 02 апреля 2017 года в 14:00 в офисе ОДО «Астотрейдинг», расположенном по адресу: г. Минск, Минский р-н, д. Боровая, 7.

**11. Порядок розыгрыша призового фонда Игры. Определение победителя Игры. Информирование победителей**

11.1. Для розыгрыша составляется Акт об участниках Игры, которые выполнили все условия Игры.

11.2. Участники, выполнившие все условия, автоматически становятся участниками розыгрыша.

11.3. Номера карт-брелоков программы «Дзякуй» всех участников, выполнивших условия Игры, распечатываются на карточках, которые помещаются в лототрон. Член Комиссии раскручивает лототрон и в случайном порядке извлекает из него 53 карточки с номерами карт-брелоков программы «Дзякуй», определяя таким образом победителей розыгрыша. Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в п.8. Правил Игры.

11.4. Итоги розыгрыша призового фонда Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии. К Протоколу комиссии прикладывается заверенный надлежащим образом Акт о транзакциях по Брелокам.

11.5. Участники Игры вправе ознакомиться с результатами розыгрыша на официальном сайте компании http://azs.a-100.by/company/news с 03.04.2017 года.

11.6. Информирование победителя производится по электронной почте путем письменного уведомления о выигрыше и СМС-сообщения на указанный в личном кабинете номер телефона в день розыгрыша 02.04.2017 года. Дополнительное информирование осуществляется путем сообщения в личном кабинете участника программы благодарности «Дзякуй» результатам проведения розыгрыша не позднее 05.04.2017 г.

**12. Порядок выдачи призов**

Выдача приза осуществляется в день розыгрыша путем зачисления на счет в личном кабинете денежных средств в размере 1 070 рублей 10 копеек или 107 рублей 1 копейка на покупку топлива в сети «А-100» (в зависимости от выбранного топлива в личном кабинете в графе «Вид топлива» при регистрации Брелока).

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускаются.

Денежные средства, зачисленные на счет в личном кабинете, необходимо использовать на АЗС ОДО «Астотрейдинг» по целевому назначению до 31.12.2017 года (включительно).

При выдаче каждого приза Организатор в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, исчисляет и удерживает из стоимости приза за счет соответствующих денежных вознаграждений, входящих в его состав, и перечисляет в бюджет подоходный налог на сумму такого приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их фамилии, имена, отчества, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе на радио, телевидении, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения.

Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

В случае отказа победителя от получения приза, неполучения приза в установленном Правилами порядке и сроки либо невыполнения условий его получения, приз остается у Организатора и используется по своему усмотрению.

**13. Состав Комиссии по проведению Игры**

Для проведения Игры, контроля за соблюдением Правил Игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения розыгрыша Организатором создается комиссия по ее проведению в следующем составе:

Председатель Комиссии – специалист по маркетингу ОДО «Астотрейдинг» Ермак Елена Александровна.

Члены Комиссии:

- ведущий специалист по маркетингу ОДО «Астотрейдинг» Пекарская Елена Геннадьевна;

- специалист по работе с клиентами ОДО «Астотрейдинг» Казеко Анастасия Алексеевна;

- главный бухгалтер ЧП «Биминок» Субоч Татьяна Евгеньевна;

- заместитель директора по правовым вопросам ОДО «Астогарант» Лабазинский Дмитрий Болеславович

**14. Информация об Игре, публикация Правил Игры**

Правила Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала рекламной игры.

Результаты Игры будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 06.04.2017 г.

Дополнительно информацию об Игре можно получить на интернет-сайте Организатора: http://azs.a-100.by/company/news

Информацию о правилах и условиях участия в рекламной игре можно получить по телефону +375 17 233-33-33 (понедельник – четверг, с 8:30 – 17:30, пятница – 8:30 – 17:00) или на сайте Организатора.

**15. Прочие условия**

Споры между Организатором рекламной игры и Участниками рекламной игры рассматриваются согласно действующему законодательству Республики Беларусь.

Свидетельство №2919
о государственной регистрации рекламной игры,
зарегестрированной 24 января 2017 года
Министерством антимонопольного регулирования и торговли
Республики Беларусь

Краіна здароўя
Выпуск №4 (379)



■ Непрыемны сімптом

# А ЛОБ ГАРЫЦЬ

## Ібупрафен, парацэтамол і альтэрнатыва гарачкапаніжальным



**Прэпараты гэтыя адпускаюцца без рэцэпта, аднак іх нельга лічыць аднолькавымі, а ўжываць трэба з вялікай асцярожнасцю. Абодва выкарыстоўваюцца для зняцця высокай тэмпературы і ліхаманкі. Больш працяглы ўжываюць ібупрафен — яго супрацьзапаленчы эфект можа праявіцца і праз нейкі час, прэпарат не толькі знімае боль, але і пазбаўляе ацёку, пачырванення. Парацэтамол жа не з'яўляецца нестэроідным супрацьзапаленчым прэпаратам, ліквідуе толькі боль.**

Як і ў выпадку з любымі іншымі лекамі, тут не падыходзіць прынцып «чым больш, тым лепш». Передазіроўка лекаў заўсёды небяспечная — не тое што палёгкі не будзе, можна наогул інвалідам застацца.

— Парацэтамол пры ўжыванні больш за 4000 мг у суткі і больш за 1000 мг за адзін раз можа парушыць функцыю печані, — расказала **загадчыца 2-га тэрапеўтычнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі Мінска Вольга ЯЧЭЙКА.** — Зафіксаваны выпадкі найцяжэйшага пашкоджання печані, калі за адзін дзень чалавек ужываў 6 і болей таблетак, кожная з якіх па 650 мг. Акрамя таго, наяўнасць у арганізме нават невялікай дозы алкаголю павышае верагоднасць узнікнення праблем з гэтым органам.

Перадазіроўка ібупрафену (больш за 3200 мг у суткі і больш за 800 мг за адзін прыём) не менш разбуральная. Ібупрафен хоць і не прыводзіць да пячоначнай недастатковасці, але выклікае сур'ёзныя пабочныя эфекты, звязаныя з кішэчнікам або страўнікам. Можа ўзнікнуць унутранае крывацячэнне, бываюць ваніты, кашаль з крывёю. Хворым з язвай страўніка, іншымі захворваннямі страўнікава-кішачнага тракту трэба з асцярожнасцю прымаць ібупрафен або аддаць перавагу парацэтамолу. Дарэчы, ён лічыцца больш бяспечным і для дзяцей.

Зніжаць тэмпературу цела неабходна толькі ў крытычных сітуацыях. У дзяцей да года гэта будзе павышэнне да 38 градусаў, у дашкалят — да 38,5 °С, у падлеткаў і дарослых — да 39,9 °С. Калі ж лічбы не дасягнулі піка, то для палёгкі можна выкарыстоўваць і народныя сродкі.

✓ Напрыклад, абціранні звычайнай вадой пакаёвай тэмпературы або гарэлкай з 3-працэнтным воцатам 1:1. Можна рабіць і кампрэсы з тым жа складам. Тканіну, складзеную ў некалькі слаёў, змочваюць у растворы з воцатам або ў вадзе і накладваюць на лоб, лыткі і ўнутраны згіб локцяў.

✓ Заліце шклянкай кіпеню 2 ст. лыжкі сухіх ягад маліны, дайце настояцца 15—20 хвілін. За паўтары-дзве гадзіны трэба выпіць тры такія шклянкі. Зніжаюць тэмпературу і свежыя ягады маліны.

✓ Змяшайце ў роўных частках сухія ягады маліны і кветкі ліпы. 2 ст. л. сумесі заліце 2 шклянкамі кіпеню, гатуйце 5 хвілін на слабым агні. Адвар прымаць цёплым, па паўшклянкі 3—4 разы ў дзень.

✓ 2—3 лыжкі свежых або замарожаных журавін расцісніце ў шклянцы і заліць цёплай вадой. Такі морс можна ўжываць без абмежаванняў.

✓ Сок і мякаць апельсіна таксама выдатны сродак ад тэмпературы. Можна нарыхтаваць парашок з цэдры і гатаваць пры высокай тэмпературы.

✓ Сталовая лыжка лісця ажыны на шклянку гарачай вады плюс лыжка мёду.

✓ Ешце вішню, грушы і кавун.

✓ Выцісніце сок аднаго лімона, разбаўце гатаванай вадой напалову. Піце цёплым і працірайце паверхню скуры.

✓ Сталовую лыжку здробненых галінак або ягад абляпіхі заліць 1,5 шклянкі кіпеню, гатаваць пад накрыўкай 15 хвілін, даць настояцца на працягу 2 гадзін.

Майце на ўвазе, што цукар часткова разбурае вітамін С, таму калі нейкія ягады падаюцца вам надта кіслымі, вазьміце лепей крыху мёду

■

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.**
protas@zviazda.by

■ Асаблівы дэфіцыт

# Пра адзін мікраэлемент і наш інтэлект



Якую соль вы купілі? Будзем спадзявацца, ёдаваную

**Асноўная частка ёду, што паступіў у арганізм, уваходзіць у склад гармонаў шчытападобнай залозы. А гармоны гэтыя неабходны для таго, каб у нас нармальна развіваліся ўсе органы і сістэмы, для ўсяго нашага фізічнага і псіхічнага здароўя. Нястача ёду прыводзіць не толькі да захворванняў шчытападобнай залозы, але і парушае рэпрадуктыўную функцыю, павялічвае дзіцячую смяротнасць, значна зніжае інтэлектуальныя, адукацыйныя, прафесійныя здольнасці нацыі.**

— Паводле апытанняў, беларусы добра ведаюць, для чаго трэба ўжываць ёдаваную соль — для разумовага і фізічнага развіцця дзіцяці, зніжэння захваральнасці шчытападобнай залозы, аднак пры гэтым высвятляецца, што ёдаваную соль многія не набываюць або проста не звяртаюць увагі, якая яна, — расказвае **загадчык навукова-даследчай лабараторыі антрапалогіі і грамадскага здароўя навукова-даследчага сектара Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А.Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Сяргей ПЯТРЭНКА.** — На тэрыторыі нашай краіны катастрафічна не хапае ў глебе і вадзе гэтага каштоўнага мікраэлемента, а значыць, расліннія і кісламалочныя прадукты не здольныя задаволіць патрэбы арганізма ў ёдзе. Асабліва востра дэфіцыт адчуваюць жыхары паўднёвых раёнаў, а таксама нованароджаныя, цяжарныя і кормячыя жанчыны. Нават калі ў пачатку цяжарнасці ўсе аналізы на гармоны шчытападобнай залозы, у тым ліку і на колькасць ёду, былі добрыя, пажадана здаваць аналізы кожныя тры месяцы, бо па меры развіцця дзіця ўмешваецца ў гарманальны баланс маці, патрэбы ў ёдзе ўзрастаюць. Плануючы цяжарнасць, таксама неабходна здаць аналіз на колькасць ёду і гармонаў, каб праверыць работу шчытападобнай залозы і папоўніць запасы мінеральнага рэчыва.

**Дэфіцыт ёду ў час цяжарнасці можа прывесці да...**

...перарывання цяжарнасці;
...затрымкі інтэлектуальнага і фізічнага развіцця дзіцяці;
...захворванняў шчытападобнай залозы ў дзіцяці;
...стомленасці, слабасці, галавакружэння, таксікозу і гестозу;
...парушэння абмену рэчываў і лішняй вагі ў маці і дзіцяці.

— Шчытападобная залоза кампенсуе дэфіцыт мікраэлемента разрастаннем, каб вылавіць у току крыві хоць якую яго колькасць, адсюль і валляк, — удакладняе Сяргей Уладзіміравіч. — Калі на гэтым фоне ў кроў трапіць радыеактыўны ёд, а ён наогул вельмі лёгка трапляе ў арганізм — праз скуру, з дыханнем, то залоза прыме яго за звычайны, стабільны і вельмі добра назапасіць. Радыеактыўны ёд выводзіцца з арганізма, але ж залоза падвяргаецца апраменьванню.

Традыцыйны метад аналізу з заборам крыві — малапрыемны, куды прасцей выявіць ёд па аналізе мачы. Мікраэлемент добра выводзіцца з мачой, і гэты метад адэкватна адлюстроўвае яго колькасць у арганізме.

— Я не раю прымаць любыя прэпараты ёду без рэкамендацыі ўрача, — дадае спецыяліст. — Як правіла, гэта патрэбна групам рызыкі, тым жа цяжарным жанчынам. А ўсім астатнім, незалежна ад узросту і роду дзейнасці, дастаткова ўжываць айчынныя прадукты: хлеб, сыр, каўбасы, кансерваваную агародніну і саму ёдаваную соль. Лішак ёду цяжка атрымаць у звычайных умовах. Калі вы з'елі крыху больш за рэкамендаваныя 5—6 г ёдаванай солі на дзень, ды яшчэ дадалі ў рацыён селядзец, крэветкі і марскую капусту, то перадазіроўкі ёду ў арганізме вы не атрымаеце. Гэтаксама калі мы апраўляемся на аздараўленне на бераг мора, актыўна ўжываем там морапрадукты, то атрымліваем нашмат больш ёду, чым тут, і пры гэтым ніякага шкоднага эфекту. Для перадазіроўкі дастаткова проста выпіць ёдавай настойкі. Даследаванні амерыканскіх вучоных паказалі, што ў такім выпадку атрымліваецца спецыфічны эфект блакіравання залозы, што выкарыстоўваюць у выпадку радыяцыйнай небяспекі, калі ў паветра трапляе шмат радыеактыўнага ёду. Тады заблакіраваная добрым ёдам залоза не будзе спажываць дрэнны. А праз некалькі дзён лішак будзе выведзены з мачой.

**ВАЖНА! Звяртайце ўвагу на тое, каб на ўпакоўцы з соллю было пазначана, колькі ёдату калію там змяшчаецца, а паводле стандарту гэта 40 мг/кг. Пасля адкрыцця ўпакоўкі такая дазіроўка захоўваецца дзесьці на працягу паўгода. Рэкамендуецца высыпаць пачак у шклянку і шчыльна закрыць, а на працягу некалькіх дзён карыстацца адкрытай салонкай. Цікава, што марская соль сама па сабе ёд не змяшчае (у марской вадзе ён існуе ў лятучай форме), таму вытворца павінен спецыяльна дадаць ёд у стабільнай форме і пазначыць гэта на ўпакоўцы.**

...Яшчэ не так даўно палова дзяцей у Кітаі не хацела вучыцца — не маглі нічога запомніць і хутка трацілі цікавасць да школы, прапускалі заняткі. Пасля высветлілася, што ў папуляцыі ёсць дэфіцыт ёду. Каля трыццаці гадоў таму краіна зрабіла ўсё, каб яго ліквідаваць, і сёння амаль сто працэнтаў малых кітайцаў не проста ходзяць у школу, але і паказваюць добрыя вынікі. Падобную тактыку абралі на пачатку мінулага стагоддзя Швейцарыя і ЗША. Хто ведае, якія гадзіннікі былі б найлепшымі ў свеце, калі б ёдавую праблему ігнаравалі да гэтага часу.

***P.S.** Прайсці даследаванне можна ў навукова-даследчай лабараторыі антрапалогіі і грамадскага здароўя інстытута імя А.Д. Сахарава (г. Мінск, вул. Іркуцкая, 65А, тэл.: +375 17 297 42 25)*

■

# МІНЕРАЛЬНЫ ПАШПАРТ

## Пра кальцый, цынк, медзь і не толькі ў нашым арганізме раскажуць валасы

Прычынай некаторых сур'ёзных захворванняў, страты валасоў або стомленасці могуць стаць таксічныя металы ў арганізме. А даведацца аб іх наяўнасці можна... па валасах, сапраўдным мінеральным пашпарце! Волас змяшчае ўсю інфармацыю пра мінеральныя рэчывы, што паступаюць у арганізм з ежай, вадой і паветрам.

— На падставе даследавання валасоў можна меркаваць пра нашы захворванні, шкодныя звычкі і ўмовы працы, — тлумачыць **навуковы супрацоўнік навукова-даследчага сектара Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А.Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат біялагічных навук Юлія ЖЫЛЬЦОВА.** — Неяк да нас звярнуўся чалавек з дэрматытам, прычыну якога ўрачы ніяк не маглі ўстанавіць. Мы выявілі ў валасах перавышэнне медзі, а пасля высветлілася, што ў гэтай сям'і не так даўно замянілі трубы на медныя. Перадазіроўка атрымалася, такім чынам, праз ваду. У валасах курцоў выяўляецца перавышэнне свінцу і кадмію, у алергікаў звычайна ў дэфіцыце цынк і кальцый, злоўжыванне алкаголем зніжае колькасць жыццёва неабходных калію, кальцыю, цынку, жалеза, магнію. Увогуле беларусам не хапае ў першую чаргу ёду, селену, медзі, цынку, назіраецца дысбаланс кальцыю, лішак якога таксама шкодны.

Вызначыць колькасць жалеза, кадмію, калію, кальцыю, марганцу, медзі, мыш'яку, нікелю, свінцу, стронцыю, тытану, хрому, цынку і іншых элементаў можна з дапамогай спектрометра энергіі рэнтгенаўскага выпраменьвання. Гэты апарат дазваляе выкарыстоўваць для даследавання не толькі валасы, але і прадукты харчавання, расліны, нават глебу...

Працэдура вымярэння займае гадзіны чатыры. Спачатку трэба ахвяраваць пасмай нефарбаваных валасоў, якім давядзецца прайсці працэдуру ачышчэння, здраблення, склейвання і прасавання ў невялікую таблетку, якая і будзе даследавана. Выдадзеная пацыенту элементаграма будзе змяшчаць інфармацыю аб дэфіцыце/лішку шэрагу мікраэлементаў і іх суадносінах, а таксама рэкамендацыі па харчаванні. Дзякуючы правільнаму харчаванню можна атрымаць аптымальную колькасць мікраэлементаў без рызыкі передазіроўкі.

«Сёлета мы пачынаем праект, які працягнецца да 2020 года і будзе праводзіцца разам з Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, — дадае Юлія Жыльцова. — Гэта будзе спроба прааналізаваць элементны склад у людзей рознага ўзросту і прафесій, якія працуюць на тэрыторыях, пацярпелых у выніку аварыі на ЧАЭС. Вынікам даследавання стануць рэкамендацыі па здароўезберагальных паводзінах з улікам элементных анамалій асяроддзя пражывання і жыццядзейнасці».

***P.S.** Прайсці даследаванне можна ў Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце імя А.Д. Сахарава па вул. Даўгабродская, 23/1, п. 304, тэл.: + 375 17 398 93 44.*





# ТОЕ, ШТО САМОМУ ПАТРЭБНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вышыня яго 140 см. Даўжыня — каля 2—2,5 метра. Кожнае памяшканне прызначана для пэўнай групы велааматараў. Мой велагараж магчыма размясціць на газоне. Бо пры яго пабудове зялёныя насаджэнні захоўваюцца — яны будуць расці непасрэдна на даху.

Арыгінальнасць канструкцыі, якую прапануе Станіслаў Дворак, у зручным спосабе адкрыцця, эстэтычнай форме збудавання, прастаце абслугоўвання, надзейнасці і практычнасці. Да таго ж, сцвярджае інжынер па адукацыі і мысленні, сама канструкцыя гаража з'яўляецца тэлескапічнай.

— Асноўная секцыя замацоўваецца на бетонным падмурку. Яна нерухомая, прымацаваная да падмурка, які выконвае антывандальную функцыю. Другая секцыя, куды будуць ставіцца веласіпеды, — высоўная, рухомая. Яна выязджае з падстрэшка на манарэйках з дапамогай ролікаў, служыць для размяшчэння на ёй захоўваемых веласіпедаў.

Каркас абедзвюх секцый выкананы з металічнага пракату, які абабіты дошкамі. У такое памяшканне, па разліках Станіслава, памесціцца ад 4 да 8 веласіпедаў. Кажа, што большая колькасць павялічыць габарыты. А значыць, паставіць пад сумненне зручнасць карыстання.

— Мы спрабавалі ўжо прасунуць наш праект, знайсці магчымых інвестараў і атрымаць дазвол для ўстаноўкі гаража непасрэдна ў двары, — расказвае Стас. — Сам працэс просты. Патрэбна сабраць подпісы жыхароў дома. Мінімум 50% павінны быць не супраць велагаража. Потым трэба звярнуцца па дазвол да начальніка ЖЭУ ці іншага кіраўніка — у залежнасці ад формы ўласнасці дома. Яшчэ адзін момант — трэба атрымаць дазвол у галоўнага архітэктара раёна ці горада. Я гэта ўжо зрабіў. У мяне ўжо ёсць план размяшчэння гаража ў двары, на якім стаіць подпіс галоўнага архітэктара Мазыра.

Зразумела ж, пытаюся ў Станіслава Дворака пра матэрыяльныя выдаткі, якія патрабуюцца, каб пабудаваць такое памяшканне для захоўвання веласіпедаў.

— Канешне, велагараж будуецца за кошт тых, хто будзе захоўваць у ім свой транспарт. Цана такога праекта на чатыры веласіпеды з уладкаваннем даху з клумбай наверсе — 470 рублёў. Уладкаванне кветніка — прыкладна 20% ад кошту велагаража ўвогуле. Таму што прымяняюцца дарагія матэрыялы. Калі такі дах не рабіць, зразумела, кошт стане меншым. Калі дзве сям'і скінуцца, гэта будзе дзесьці па 150—200 рублёў на кожную.

Выкрасці такі гараж разам з транспартнымі сродкамі не атрымаецца,




сцвярджае Станіслаў, бо для гэтага спатрэбіцца яго вырваць з зямлі. Кажа, што незалежна ад таго, як да яго ідэі паставяцца на рэспубліканскім узроўні, для сваёй сям'і ён велагараж пабудуе. Між тым лічыць, што ідэю маглі б падхапіць і распаўсюдзіць службы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Калі ідэя людзям спадабаецца, гараджане маглі б замаўляць камунальнікам будаўніцтва такіх дамкоў для веласіпедаў.

— Гэта можа ўрэшце стварыць некалькі рабочых месцаў. Калі будуць замовы ад гараджан, камунальнікі стануць будаваць гаражы цэнтралізавана. Гэта спросціць працэс узгаднення і ўстаноўкі. Калі будуць рабіць са свайго матэрыялу — можа выйсці танней, чым разлічыў я. Калі патрэбна — я магу абсалютна бясплатна падзяліцца сваёй распрацоўкай з усімі ахвотнымі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## ■ Факт

### Вымагаў і атрымае

**Пры атрыманні хабару ў памеры 2 тысяч долараў затрыманы з наяўнымі начальнік Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.**

За выдачу заключэння аб адпаведнасці аб'екта будаўніцтва дзеючым нормам і правілам у галіне прамысловай бяспекі службовая асоба вымагала і атрымала хабар ад прадстаўніка замежнай камерцыйнай арганізацыі, якая рэалізуе ў краіне буйны інвестыцыйны праект, паведамляе прэс-служба Камітэта дзяржбяспекі. Заведзена крымінальная справа. Санкцыяй артыкула прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да шасці гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## ■ Здарэнні

### Злодзеяў вабяць мабільнікі

**У сталіцы затрымалі 22-гадовага мінчаніна, які ўкраў мабільны тэлефон у начным клубе, а затым прапанаваў вярнуць яго за ўзнагароджанне гаспадыні.**

Малады чалавек звярнуў увагу на тэлефон, пакінуты без нагляду на барнай стойцы. Агледзеўшыся па баках, ён выключыў мабільнае ўстройства і выйшаў з ім з начнога клуба, паведамілі ў Партызанскім РУУС. Калі пазней на ўкрадзены тэлефон пачала званіць уладальніца, малады чалавек пагадзіўся вярнуць яго за ўзнагароджанне ў памеры 200 рублёў. Дзяўчына пагадзілася, але на сустрэчу прыйшла не з грашыма, а з супрацоўнікамі міліцыі. У Мінску ж інтэрнэт-знаёмства таксама скончылася крадзяжом мабільнага тэлефона. Дзяўчына пазнаёмілася ў сеціве з хлопцам, якога потым разам з пасіяй апошняга запрасіла ў госці. У канцы вечара малады чалавек, скарыстаўшыся тым, што гаспадыні не было ў пакоі, украў яе тэлефон, а таксама пашпарт. Па інфармацыі Савецкага РУУС г. Мінска, потым ён здаў мабільнік у ламбард.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


**Уважаемые акционеры ОАО «СУ-153» г. Борисов!**

**2 марта 2017 года** состоится очередное общее собрание акционеров

ОАО «СУ-153»

г. Борисов

Собрание пройдет по адресу: г. Борисов , ул. Чапаева, д. 82 (ОАО «Стройтрест 21», актовый зал).

Регистрация участников собрания с 14.30 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – **2 марта 2017 г. в 15.00**.

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию реестра на 1 марта 2017 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру общества – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

представителю акционера – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность и заверенную доверенность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности за 2016 год. Основные направления деятельности на 2017 год.
2. Утверждение годового баланса и отчетов, счетов прибыли и убытков Общества за 2016 год.
3. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе за 2016 год.
4. Утверждение направлений использования прибыли за 2016 год.
5. Об оказании безвозмездной спонсорской помощи в 2017 году.
6. Утверждение заключения ревизионной комиссии по результатам проверки финансово-хозяйственной деятельности за 2016 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета, ревизионной комиссии.

**Телефоны для справок: 73 23 28, 74 47 85.**

УНН 600135785

Наблюдательный совет



15 марта 2017 г. №2-С/2017

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Наличие ограничений | Целевое назначение | Начальная стоимость, руб./коп. | Сумма задатка, руб./коп. | Затраты на подготовку документации, руб./коп. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Вересковая, 4 (участок №1) | 340100000002005875 | 0,0951 | ограничений в использовании не имеет | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 17 003 р. 20 коп. | 400 р. 00 коп. | 2 425 р. 55 коп. |
| 2 | ул. Вересковая, 4 (участок №2) | 340100000002005876 | 0,1374 | | | 24 566 р. 13 коп. | 400 р. 00 коп. | 2 642 р. 18 коп. |
| 3 | пер. Старowолотовской, 1-й, 5 | 340100000002005884 | 0,1000 | водоохранная зона рек и водоемов, охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, объектов газораспределительной системы. *Проведение комплекса противопаводковых мероприятий (защита территории от 1% затопления паводковыми водами)* | | 31 989 р. 84 коп. | 400 р. 00 коп. | 2 535 р. 37 коп. |

1. Организатор аукционных торгов – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина.
3. **Аукцион состоится 15 марта 2017 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном кометете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.
4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка, в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).

Необходимые документы:

4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.4. при подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношени нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 №83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в аукционе принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 1 февраля по 13 марта 2017 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница – с 08.00 до 16.30 (обед 12.00-13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.40 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. №115.

**Контактный телефон: 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**



г. Клецк 2 марта 2017 года

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

| № лота | Месторасположение земельного участка, кадастровый номер | Вид аукциона | Характеристика инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Срок аренды, лет | Назначение участка | Условия продажи | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Клецк, ул. Советская №62250100001000227 | на право заключения договора аренды | водопровод, газопровод, электроснабжение, теплоснабжение, асфальтированный подъезд | 0,2398 | 20 лет | для строительства и обслуживания административно-торгового комплекса | осуществление госрегистрации прав на земельный участок в двухмесячный срок после подписания договора аренды, разработка ПСД в течение 2 лет после утверждения протокола о результатах аукциона, занятие земельного участка в течение 6 месяцев со дня утверждения ПСД | 50000 | 5000 | 1805,33 |

1. Аукцион состоится **2 марта 2017 г. в 11 часов** в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, каб. 420.
2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели, юридические лица, граждане Республики Беларусь. Аукцион проводится при наличии двух или более участников. Участнику необходимо подать заявление в Клецкий райисполком с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, представляется документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении с отметкой банка, представляется копия паспорта, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителями индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 204; последний день приема документов – **1 марта 2017 г. до 11.00**. Заключительная регистрация участников – **2 марта 2017 г. с 10.00 до 10.45**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.
4. **Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3641207430710 в ЦБУ №607 г. Клецк, филиал №620 г. Несвиж ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Клецк, код 523. Получатель – Клецкий райисполком, УНП 600198162.**
5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее, чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.
6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату за право заключения договора аренды земельного участка.
7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомится с объектом продажи. Контактные телефоны в Клецке: **(8-01793), 68211,**
**сайт: www.kletsk.minsk-region.by**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ПРА НАСЕННЕ

*Набліжаецца час сяўбы расады некаторых культур. Купля насення і абавязкова звязаны з гэтым выбар сартоў — найважнейшыя задачы, рашэнне якіх шмат у чым вызначыць будучы ўраджай.*

### Як вызначыць патрэбную колькасць?

Каб зрабіць прыкладны разлік, трэба ведаць, колькі градак, якой плошчы і якіх культур вы будзеце высейваць. Зыходзячы з гэтага, зрабіце разлік неабходнай колькасці насення.

Улічвайце, што на 10 квадратных метраў высейваюць:

- насення кабачка — 3—4 г,
- морквы — 5—6 г,
- буракоў сталовых — 10—12 г,
- радыскі — 18—20 г,
- рэдзькі — 4—6 г,
- рэпы — 2 г,
- салаты — 2—3 г.

### Як вызначыць вагу, калі колькасць на ўпакоўцы пазначана ў штуках?

Па памеры насенне агародніннных раслін дзеляць на:

•вельмі буйное — у гарбуза, кабачка, бабоў, фасолі, кавуна. У 1 граме такога насення налічваецца да 10 штук зярнят;

• буйное — у агурка, дыні, радыскі, рэдзькі, буракоў. У 1 г такога насення налічваецца ад 15 да 100 штук зярнят;

• сярэдняга памеру — у капусты ўсіх відаў, тамата, перцу, баклажана. Іх у 1 г бывае ад 150 да 350 штук зярнят;

• дробнае і вельмі дробнае — у морквы, пятрушкі, салаты, сельдэрэя, рэпы. У 1 г налічваецца ад 600 да 1000 штук зярнят.

Буйнога насення расходуецца больш, дробнага — менш. Розная і глыбіня іх закладкі ў глебу пры пасеве: вельмі буйное і буйное сеюць на глыбіню 3—4 сантыметры, сярэдняга памеру — на 2—3 сантыметры, дробнае — не глыбей сантыметра. Пры гэтым неабходна рабіць папраўку на склад глебы: на лёгкіх, пясчаных глебах насенне сеюць глыбей, чым на цяжкіх.

### Па якіх крытэрыях выбіраць сарты агародніны?

Кожны сорт характарызуецца шматлікімі паказчыкамі: скараспеласцю, ураджайнасцю, лёжкасцю, транспартабельнасцю, смакавымі, пажыўнымі і лячэбнымі якасцямі, устойлівасцю да хвароб і шкоднікаў і многімі іншымі характарыстыкамі.

Зразумела, што прыярытэты ў кожнага агародніка свае: камусьці важнейшая ўраджайнасць, камусьці — устойлівасць культуры да хвароб. Але ёсць агульныя для ўсіх правілы, якія варта ведаць і ўлічваць.

***Улічвайце тэрмін паспявання***

Сарты і гібрыды ўсіх культур умоўна падзяляюцца на раннія, сярэднясмпелыя і познія. Такое вызначэнне ўстаноўлена ў залежнасці ад працягласці перыяду вырошчвання — вегетацыі, які доўжыцца ад з'яўлення ўсходаў да пачатку збору ўраджаю. Загадзя плануйце, які ўраджай і ў якія тэрміны вам неабходна атрымаць, і ў залежнасці ад гэтага прымайце рашэнне пра сарты. Да таго ж памятайце, што позняя сарты агародніінных культур больш ураджайныя і назапашваюць больш вітамінаў і карысных рэчываў, чым ранняя.

***Выбірайце раяніраваныя сарты***

Перш чым купляць насенне, трэба высветліць, ці раяніраваны выбраны сорт у вашай мясцовасці, ці хопіць цяпла для яго вырошчвання. З раяніраваннем апошнімі гадамі таксама не ўсё проста: за рэгістрацыю новага сорту і гібрыда неабходна плаціць грошы, таму многія фірмы не рэгіструюць афіцыйна новыя сарты і гібрыды і не раяніруюць іх. Так што абапірайцеся на свой вопыт і вопыт сваіх знаёмых, сяброў, суседзяў-дачнікаў.



Каб засцерагчыся ад падробак, купляйце насенне правераных фірмаў.

### Што такое гібрыднае насенне і ў чым яго перавагі?

Дасведчаныя садоўнікі імкнуцца набыць гібрыднае насенне. Яго атрымліваюць у выніку накіраванага адбору ад скрыжавання ўраджайных сартоў з рознымі каштоўнымі біялагічнымі і гаспадарчымі прыкметамі. Расліны гібрыднага насення прынята пазначаць літарай F (ад пачатковай літары лацінскага алфавіта, якая азначае ў перакладзе «дзеці»). Лічба, якая стаіць побач, паказвае, якое гэта пакаленне.

Расліны першага пакалення F1, як правіла, пераўзыходзяць бацькоўскія па ўраджайнасці і іншых прыкметах. Гэту з'яву называюць гетэрозіс, а гібрыды — гетэрозіснымі. Многія гетэрозісныя гібрыды раяніраваны і шырока выкарыстоўваюцца ў вытворчасці агародніны.

Агародніку неабходна ведаць, што насенне гетэрозісных раслін не захоўвае ўласцівасцяў бацькоў. Гетэрозіснае гібрыднае насенне кожны раз атрымліваюць, скрыжоўваючы матчыны і бацькавы сарты або лініі. Працэс гэты складаны і працаёмкі, таму гібрыднае насенне даражэйшае за сартавое. Акрамя таго, тэхналогія гібрыдызацыі і падбору бацькоў — інтэлектуальная ўласнасць аўтара-селекцыянера. А гэта таксама каштуе грошай.

## Месяцавы пасяўны каляндар на люты 2017-га

**Спрыяльныя дні для пасадкі расады:**

• Таматы, агуркі, перац, баклажаны: 4, 7—9

• Суніцы: 4, 7, 9, 23

***Месяц расце***

*1—2 лютага Месяц у Авене.* Непажаданая пасадка і пасеў насення, якое доўга ўзыходзіць. Спрыяльныя дні для работы з глебай.

*3—4 лютага Месяц у Цяльцы.* Вельмі спрыяльныя дні для любых работ.

*5—6 лютага Месяц у Блізнятах.* Спрыяльныя дні практычна для любых работ. Не сеюць травы.

*7—9 лютага Месяц у Раку.* Выдатныя дні для любых работ з раслінамі.

*10 лютага Месяц у Льве.* У гэты перыяд не спрыяльны паліў.

***Поўня***

*11 лютага Месяц у Льве.* Ніякія работы не рэкамендуюцца.

***Месяц убывае***

*12—13 лютага Месяц у Дзеве.* Саджаюць кветкі, кусты, дрэвы, не прызначаныя для доўгага плоданашэння.

*14—15 лютага Месяц у Шалях.* Добры ўраджай дасць зяленіва, пасаджанае ў гэты перыяд.

*16—18 лютага Месяц у Скарпіёне.* У гэты перыяд не саджаюць цыбульныя.

*19—20 лютага Месяц у Стральцы.* Старайцеся пазбягаць работы з лісцем і кронай, каб залішне не траўмаваць расліну.

*21—23 лютага Месяц у Казярогу.* Любыя віды работ будуць мець добры вынік.

*24—25 лютага Месяц у Вадалеі.* Пазбягайце работ з раслінамі.

***Маладзік***

*26 лютага Месяц у Авене.* Выключыце ўсе віды работ з раслінамі.

***Месяц расце***

*27—28 лютага Месяц у Авене.* Непажаданы пасеў насення, якое доўга ўзыходзіць.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.56 | 17.51 | 8.55 |
| Віцебск — | 8.50 | 17.36 | 8.46 |
| Магілёў — | 8.46 | 17.41 | 8.55 |
| Гомель — | 8.37 | 17.43 | 9.06 |
| Гродна — | 9.10 | 18.07 | 8.57 |
| Брэст — | 9.06 | 18.13 | 9.07 |

**Месяц**

***Маладзік 28 студзеня. Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Антона, Арсенія, Макара, Марка, Мікалая, Пятра, Фёдара.* ***К.*** *Ігната.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Каўбаса і сыр маюць да мяне ўсё большую адданасць, таму я вымушана замыкаць іх на ўсю ноч у халадзільнік, хоць гэта не заўсёды дапамагае.**

Правільная жанчына павінна ўмець рабіць тры рэчы: прыставаць, пакарміць і не прыставаць.

**Я па дурасці перад наведваннем цырка паеў кавуна, таму пры выступленні клоўнаў усім было смешна, а мне страшна.**

— Мілы, ты ў мяне такі скарб, што хочацца засунуць цябе ў куфар, вывезці на бязлюдны востраў і там закапаць...

**Я вельмі люблю падарожнічаць.**

**Учора наведаў кухню — сталіцу кватэры.**

У заапарку два нецвярозыя мужыкі стаяць каля малпаў.

Самец гарылы:

— Што хлопцы гледзіце, свабодных клетак няма.



Малюнак Аляксандры ПЯТРОВАЙ.

Даты | Падзеі | Людзі

### 1 ЛЮТАГА

**1857** год — нарадзіўся Уладзімір Міхайлавіч Бехцераў (1857—1927), вядомы рускі псіхолаг, псіхіятр, неўролаг, заснавальнік рэфлексалогіі. Арганізатар і кіраўнік Псіханеўралагічнага інстытута (цяпер носіць яго імя) і Інстытута мозга і псіхічнай дзейнасці.



**1865** год — прэзідэнт ЗША Аўраам Лінкальн падпісаў рэзалюцыю Кангрэса аб унясенні 13-й папраўкі ў Канстытуцыю ЗША аб адмене рабства. З таго часу ў ЗША гэтую дату адзначаюць як Нацыянальны дзень свабоды. Да снежня 1865 года тры чвэрці штатаў краіны ўхвалілі гэты дакумент. 18 снежня 1865 года 13-я папраўка ўступіла ў сілу. Рабства ў ЗША было адменена.

**1913** год — нарадзіўся Сяргей Восіпавіч Прытыцкі, дзяржаўны і палітычны дзеяч Беларусі, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1944—1945 — намеснік начальніка, начальнік Польскага штаба партызанскага руху. У 1949—1962 гадах — першы сакратар Гродзенскага, Баранавіцкага, Маладзечанскага, Мінскага абкамаў КПБ. З 1962 года — сакратар ЦК КПБ, старшыня партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, намеснік старшыні СМ БССР. З 1968 года — старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Памёр у 1971 годзе.

**1942** год — 75 гадоў таму нарадзіўся Леў Валяр'янавіч Лешчанка, савецкі і расійскі эстрадны спявак, народны артыст РСФСР.

**1975** год — амерыканскія спецыялісты Біл Гейтс і Пол Ален заснавалі кампанію «Майкрасофт». Цяпер гэта — вядучы сусветны вытворца праграмнага забеспячэння для персанальных камп'ютараў.

### Было сказана

**Янка БРЫЛЬ, народны пісьменнік Беларусі:**

*«Прадаваць свае мазгі за мяжу не зможа той, у каго яны непарыўна знітаваны з сумленнем сына свайго народа».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 442.

Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12